

ПАСКОРАНАЕ РАЗВІЦЦЁ: АКЦЭНТ НА РЭГІЁНАХ МС

НАНАТЭХНАЛОГІІ Ў АБЛІЧЧЫ XXI СТАГОДДЗЯ МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ВЕРАСНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 184 (29051)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Давайце будзем аб'ектыўныя — сёння свет не становіцца больш прадказальным. Дэфіцыт даверу ва ўзаемаадносінах паміж дзяржавамі суправаджаецца абвастрэннем канфрантацыйнай рыторыкі, адкрытым грэбаваннем нормамі і прынцыпамі міжнароднага права, спробамі ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў, імкненнем расхістаць сітуацыю ў розных рэгіёнах і краінах свету. Такая сітуацыя толькі спрыяе распаўсюджванню адной з галоўных пагроз міжнароднай стабільнасці і бяспекі — тэрарызму. Хачу нагадаць, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы на канферэнцыі высокага ўзроўню «Барацьба з тэрарызмам пры дапамозе інавацыйных падыходаў і выкарыстання новых і ўзнікаючых тэхналогій», прапанаваў ініцыятыву аб фарміраванні «пояса лічбавага добрасуседства». На нашу думку, заключэнне міжнародных пагадненняў і дамоўленасцяў дазволіць забяспечыць інфармацыйную бяспеку і аднавіць давер, а таксама больш эфектыўна процідзейнічаць выклікам і пагрозам тэрарызму, у тым ліку ў віртуальнай прасторы».*

## КОРАТКА

• Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні ў сувязі са смерцю былога Прэзідэнта Французскай Рэспублікі Жака Шырака.



• **Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту Беларусі ў студзені—жніўні склаў Br3 млрд.**

• На «Оскар» ад Беларусі намінаваны дакументальны фільм «Дэбют» Анастасіі Мірашнічэнкі.


ISSN 1990 - 763X


# ПА-СУСЕДСКУ ШЧЫРА

**Напярэдадні II Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прадстаўнікамі найбуйнейшых украінскіх СМІ**

**Гутарка ў Палацы Незалежнасці доўжылася тры з паловай гадзіны, яна атрымалася шчырая і вельмі насычаная, ахапіла не толькі тэмы беларуска-ўкраінскіх адносін. У ёй узялі ўдзел шэсць украінскіх журналістаў: Аляксандр Харчанка, генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва «Укрінформ»; Аляксандр Мартыненка, генеральны дырэктар інфармацыйнага агенцтва «Інтэрфакс-Украіна»; Юрый Сугак, дырэктар дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання, галоўны рэдактар тэлеканала «Україна»; Павел Кужэеў, галоўны рэдактар тэлеканала «112 Україна»; Вольга Кашаленка, спецыяльны карэспандэнт, палітычны аглядальнік тэлевізійнай службы навін тэлеканала «1+1», і Сяргей Брага, галоўны рэдактар газеты «Урядовий кур'єр».**


СТАР. 2




Фота БелТА.

# Чыстая справа



**Жыхары вёскі Басянкі Мёрскага раёна Аляксандр ЯКУШЫН і Павел ШАМРОВІЧ дапамагаюць прыродзе наваколля заставацца чыстай і прыгожай: яны прыбіраюць смецце, якое пакідаюць пасля сябе турысты, рыбакі, ягаднікі — на дарогах і сцежках, што вядуць у глыб балота Жады, на стаянцы каля возера Стрэчна. Вёска Басянкі — адна з найбліжэйшых да балотнага масіву, таму Аляксандр і Павел у свой вольны час сядаюць на ўсюдыход і робяць санітарны аб'езд.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Моцныя людзі

# «Дзе б я ні быў, заўсёды хачу дадому»

## Спорт, танцы і яркае жыццё, нягледзячы на інвалідную каляску

**Яму 58, ён жыве ў Мінску, займаецца рэабілітацыяй людзей з інваліднасцю, выкладае ва Універсітэце фізічнай культуры, аб'ездзіў мноства краін, з'яўляецца ганаровым грамадзянінам горада Пенсакола, штат Фларыда, ЗША. І пры гэтым наш герой ужо 35 гадоў як перамяшчаецца ў інваліднай калясцы. І калі, прачытаўшы гэты артыкул, нехта і далей будзе ныць, што нічога не можа, таму што лёс абышоўся з ім занадта жорстка і абставіны былі няўмольныя, — значыць, гэты чалавек проста не ўмее чытаць.**

**Перад вамі — аповед пра моцнага і мудрага мужчыну, які, як гавораць амерыканцы, зрабіў сябе сам.**

### Удар, які змяніў усё жыццё

— Я адслужыў у войску, паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут, — апавядае Барыс Бачкоўскі. — У 1984 годзе я, студэнт 3-га курса, паехаў па камсамольскай пуцёўцы ў Цюмень — зарабіць грошай. Усе мае сваякі загінулі ў вайну, бацька вырас у дзіцячым доме, таму мы жылі вельмі небагата...

Але зарабіць Барысу не ўдалося. У адзін з вечароў ён, абараняючы дзяўчыну ад бандыта, атрымаў нажавое раненне. Наступствы аказаліся катастрафічнымі: з-за таго, што пацярпеў пазваночнік, хлопца паралізавала.

Было яму тады 23 гады.

— Сябры мяне спачатку наведвалі, падтрымлівалі, — успамінае Барыс Ісакавіч. — Але паступова яны з'яўляліся ўсё радзей і радзей, пакуль са мной не застаўся ўсяго адзін сябар, які быў у мяне з вайсковых часоў. Мы і да гэтага часу сябруем. Потым, дарэчы, тыя сябры — хто праз 20, а хто і праз 30 гадоў — зноў сталі наведвацца: ім было цікава, што са мной стала.


СТАР. 4

# ПА-СУСЕДСКУ ШЧЫРА

## Мы зацікаўлены ў міры

Гэта першая сустрэча з прадстаўнікамі ўкраінскіх СМІ ў такім фармаце, і Прэзідэнт Беларусі прапанаваў зрабіць падобныя сустрэчы традыцыйнымі.

«Па-першае, я вельмі шмат даведаюся ад вас пра тое, што адбываецца цяпер ва Украіне. У агульных рысах я ўяўляю, але настрой, канешне, не адчуеш, калі ты там не бываеш, не сустракаешся з прадстаўнікамі ўкраінскага грамадства. З другога боку, у мяне ёсць магчымасць без усякіх крыватолкаў і домыслаў данесці сваю пазіцыю па фундаментальных пытаннях нашых адносін», — сказаў ён.

У сваёй уступнай прамове Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларусы і ўкраінцы настолькі цесна звязаныя агульнымі каранямі — гістарычнымі, духоўнымі, сямейнымі, — што не маюць права страціць гэта адзінства. «Гэта ідэалагічны пасыл, які ляжыць у аснове ўсіх маіх разваг па сітуацыі ва Украіне», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт назваў Украіну найважнейшым суседам Беларусі, адным з галоўных гандлёва-эканамічных партнёраў, што робіць адносіны з ёй прыярытэтнымі.

«Беларусь надзвычай зацікаўлена ў трывалым міры і стабільнасці ў нашых украінскіх сяброў, — пацвердзіў пазіцыю Аляксандр Лукашэнка. — Сённяшні канфлікт на ўсходзе Украіны — гэта боль у сэрцах беларусаў. Наш боль». Прэзідэнт паўтарыў, што Беларусь будзе рабіць усё, што ад яе залежыць, для дасягнення міру ва Украіне: ад забеспячэння работы Трохбаковай кантактнай групы ў Мінску, аказання гуманітарнай дапамогі да ўдзелу ў аднаўленні інфраструктуры Данбаса. «Мы зробім любыя крокі, якія дапамогуць наблізіць нас да міру, — паабяцаў Прэзідэнт. — Тыя крокі, якія патрэбныя будуць удзельнікам гэтага канфлікту, і перш за ўсё — украінскаму народу».

## Не сябруем супраць

Журналісты прапанавалі распачаць размову з тэмы геапалітыкі: наколькі здольнае паляпшэнне адносін Беларусі з ЗША паўплываць на адносіны паміж Беларуссю і Украінай. На гэта кіраўнік беларускай дзяржавы адказаў адмоўна. Па-першае, Беларусь незалежная і суверэнная дзяржава, а па-другое, яна ніколі не дазваляла і не дазволіць нікому прымушаць сябе да выбару паміж Усходам і Захадам. Ён заўважыў, што амерыканскія высокапастаўленыя палітыкі з павагай адносяцца да такой пазіцыі. І тое, што мы паступова наладжваем адносіны з ЗША, не павінна насцярожваць нашых усходніх суседзяў, бо гэта нармальна — выбудоўваць добрыя адносіны з дзяржавамі — сусветнымі гігантамі.

«Мы не сябруем з Амерыкай супраць Расіі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гэта выключана. Спадабаецца вам гэта або не. Гэта істотная пазіцыя. Гэта мая пазіцыя».

Ён нагадаў, што саюзніцкія адносіны з Расіяй падтрымала большасць насельніцтва Беларусі на рэферэндуме. Нармалізацыя ж адносін з ЗША не азначае прыніжэння Беларусі.

Што датычыцца пазіцыі Беларусі па Украіне, яе беларускі лідар абазначыў дакладна: «Украіна павінна быць адзінай і непадзельнай».

## Вайна павінна быць спыненая

У размове з украінскімі журналістамі Аляксандр Лукашэнка выказаў думку, што ў вырашэнні канфлікта на ўсходзе Украіны ўжо мінуў час жаданняў і настрояў. Што настаў час канкрэтных дзеянняў.

Цяпер сітуацыя вельмі сур'ёзна змянілася, асабліва пасля апошніх прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне, але аднаго жадання новага кіраўніка ўкраінскай дзяржавы недастаткова, каб спыніць гэту вайну. Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра прапанову сесці за стол перагавораў прадстаўнікам трох славянскіх народаў: украінцаў, расіян і беларусаў. Але гэтая прапанова не была падтрымана. Тады ён прапанаваў падключыць да перагаворнага працэсу Злучаныя Штаты Амерыкі.

Прэзідэнт падкрэсліў: «Вы павінны ведаць: мы не будзем напрошвацца да вас у міратворцы. Мы не будзем напрошвацца ў пасрэднікі. Гэта ўвогуле выключана... Я не прымаю гэтага. Я проста па-чалавечы, па-мужчынску хачу, каб гэтае пытанне вырашалася. Калі гэта патрэбна будзе — мы гатовы сыграць пэўную ролю».

На думку Прэзідэнта Беларусі, украінскім уладам, калі яны сапраўды хочуць захаваць межы Украіны і ўз'яднацца з усходнімі тэрыторыямі, варта пайсці на ўсё: на правядзенне выбараў, на забеспячэнне гарантый удзельнікам ваенных дзеянняў і іншае. «Трэба сёння рабіць любыя крокі для таго, каб гэтая вайна была спыненая і гэтая тэрыторыя пачала вяртацца ва Украіну», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## Пра сустрэчу Трампа і Зяленскага

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што сустрэча прэзідэнтаў ЗША і Украіны Дональда Трампа і Уладзіміра Зяленскага, якая адбылася напярэдадні ў Нью-Ёрку, прайшла добра.

«Вы кажаце: ААН, гарачы дзень... Звычайны дзень. Я стары палітык, шмат разоў бываў у ААН. Звычайны дзень,


Фота БелТА.

але вы яго зрабілі гарачым. Прытым добра, прыгожа зрабілі, — сказаў Прэзідэнт. — І сустрэча Уладзіміра Зяленскага з Дональдам Трампам так, як я яе бачыў, — прыстойна, разумна, прыгожа. Усё было прыгожа. Але такіх гарачых пунктаў з вашай падачы ў ААН бываюць дзясяткі, толькі хтосьці менш звяртае ўвагі. Цяпер яшчэ афарбоўку надалі гэтыя тэлефонныя размовы, канспіралогія нейкая з'явілася. Вось гэта прыцягнула пэўную ўвагу».

«А наогул гэта было знаёмства двух прэзідэнтаў сам-насам. Яно прайшло, з майго пункту гледжання, вельмі добра. Яны спадабаліся адзін аднаму. Можна сказаць, што гэты гарачы дзень быў нармальным для амерыканска-ўкраінскіх адносін», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## Пра эканамічны складнік узаемаадносін дзвюх краін

Чарговае пытанне ўкраінскія журналісты задалі нарэшце эканамічнага складніка ўзаемаадносін дзвюх краін. У прыватнасці, іх хвалюе значнае (амаль у два з паловай разы) адмоўнае для Украіны сальда ва ўзаемным гандлі.

«Гэта звязана не толькі з гандлем традыцыйнымі таварамі, а з супертрадыцыйнымі таварамі — нафтапрадуктамі, якія падаражэлі значна, без якіх Украіна не можа абысціся, — адказаў Прэзідэнт. — Мы невялікую дабаўленую вартасць маем, бо з дарагой нафты вырабляем нафтапрадукты і прадаём вам. А ад гэтай цаны мы фактычна за нафту вялізныя грошы плацім. Мы тут асабліва не выйграем, але на статыстыку гэта ўплывае».

Калі будзе імкненне, сальда можна скараціць і выйсці на раўнаважны гандаль, не сумняваецца беларускі лідар. «У нас да вас вельмі вялікая цікавасць, — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. — Па вельмі-вельмі многіх кірунках, вы нават сабе не ўяўляеце. Нават па ракетабудаванні».

Ён дадаў, што ёсць і маса мірных праектаў, у тым ліку гэта дарога па Прыпяці і Дняпры, — праект, які пакуль не быў рэалізаваны. Для аднаўлення суднаходства па Дняпры патрэбная больш актыўная дзейнасць украінскага боку. Беларусь зрабіла ўсё неабходнае для рэалізацыі гэтага праекта. Пытанне, па словах Аляксандра Лукашэнкі, толькі адно — гэта паглыбленне дна Прыпяці і Дняпра. Абавязацельствы па паглыбленні Прыпяці, якія ўзяла на сябе наша краіна, выкананы. «Пытанне за вамі. Трэба паглыбіць дно, каб усюды па Дняпры маглі прайсці судны «рака—мора», — сказаў кіраўнік краіны. У Беларусі планавалася будаўніцтва порта «рака-мора» на глыбакаводным участку Дняпра каля вёскі Ніжнія Жары Брагінскага раёна, што на граніцы з Украінай. Плануецца паглыбленне фарватару ракі на ўчастку паміж портам і Кіеўскім вадасховішчам. «Гэты порт фактычна гатовы прымаць судны (там мы прыцягнулі і прыватныя інвестыцыі). Калі ўбачым, што Украіна вельмі зацікаўлена, мы тут дададзім, зробім порт і вырашым іншыя пытанні на яшчэ больш высокім узроўні», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка. Ён упэўнены, што гэта будзе вельмі сур'ёзны штуршок у аднаўленні суднаходства, асабліва з улікам выдатнай лагістыкі па сушы з Балтыкай.

«Мы маглі б з поўначы па рацэ ў Чорнае мора пусціць патокі грузаў. Прыстойная для Украіны і Беларусі лагістычная і транзітная прывабнасць, рабочыя месцы, будзем залежаць больш адно ад аднаго. Чаму гэтым не займацца?» — пералічыў перавагі праекта беларускі лідар.

Беларусь прапрацоўвае варыянты пастаўкі нафты з рынкаў, альтэрнатыўных расійскаму, паведаміў кіраўнік дзяржавы, у прыватнасці, згадаўшы аб падатковым манеўры ў нафтавай сферы Расіі, адзначыўшы, што Беларусь у выніку гэтага вымушана шукаць альтэрнатыўныя варыянты паставак.

«Я на перагаворах сказаў адкрыта: мы маем тры варыянты, пралічваем пастаўкі нафты на свае заводы. Больш за тое, мы гэтыя заводы сёлета ў асноўным мадэрнізуем. Яны ўжо будуць прыбытковыя, калі мы купім дарагую нафту ў Міжземным ці Чорным моры або на Балтыцы. Мы купім, перапрацуем і не будзем цярпець страт», — заявіў беларускі лідар.

Беларусь гатова сумесна з Украінай развіваць сетку аўтамабільных дарог, калі будуць распрацаваны эканамічна абгрунтаваныя праекты. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што асноўныя трасы, якія праходзяць праз Беларусь, знаходзяцца ў добрым стане. Асобныя рэканструююць, у прыватнасці дарогу з Мінска ў Вільнюс. Гэты праект рэалізуецца пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага інвестыцыйнага банка. «Хочам пракласці дарогу па поўдні з Гомеля на Брэст паралельна граніцы Украіны, кіламетраў за 200—300 ад яе, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Там ёсць дарога, але яна не для вялікага патоку. Мы маглі б з Кітая, Казахстана, Расіі па паўднёвай частцы накіраваць грузапаток па гэтай дарозе». Рэалізацыя праекта плануецца ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

«У нас сетка дарог прыстойная, але хочам дадаць яшчэ тры-чатыры напрамкі», — паведаміў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, калі будуць эканамічна абгрунтаваныя маршруты з Украіны праз Беларусь, наша краіна гатова «хоць заўтра прапрацоўваць і ўкладваць грошы». Тым больш што Беларусь валодае апрабаванай сучаснай тэхналогіяй будаўніцтва дарог, ёсць прафесійныя, абучаныя кадры ў гэтай галіне. Беларускія дарожна-будаўнічыя арганізацыі ўжо маюць паспяховы вопыт рэканструкцыі і мадэрнізацыі трас ва Украіне.

## Аб сустрэчы з Зяленскім: мы знойдзем агульную мову

Аляксандр Лукашэнка разлічвае, што падчас будучай сустрэчы з Прэзідэнтам Украіны Уладзімірам Зяленскім на Форуме рэгіёнаў дзвюх краін у Жытоміры кіраўнікі дзяржаў бліжэй пазнаёмяцца з пазіцыяй адзін аднаго.

Прэзідэнт адзначыў, што гэтая сустрэча дасць магчымасць не проста пазнаёміцца асабіста на чалавечым узроўні, але і лепш зразумець і даведацца пра пазіцыю адзін аднаго па тых ці іншых пытаннях.

«Абяцаю, што буду праўдзівы і шчыры ў размове. Гэта мая фішка. Я прывык гаварыць шчыра», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Гарантую вам, мы з ім знойдзем агульную мову», — запэўніў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што калі і з боку суразмоўцы адчуе сумленнасць і шчырасць, то паміж імі складуцца добрыя адносіны, і ніхто не зможа гэтага парушыць.

## На ўзаемнай аснове

Прэзідэнт Беларусі гатовы ў найбліжэйшы час на ўзаемнай аснове вырашыць пытанне з памілаваннем асуджанага ў Беларусі за шпіянаж украінца Паўла Шаройкі і абвінавачанага ва Украіне беларускага грамадзяніна Юрыя Палітыкі.

Такія дамоўленасці былі ў свой час з былым Прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам. Гэтыя пытанні, па словах Аляксандра Лукашэнкі, атручваюць адносіны дзвюх краін.

«Я гатовы выканаць свае абяцанні, калі ўкраінскі бок выканае свае», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што праблему можна вырашыць і зараз: «Калі бачыце, што памыліліся, папрасіце прабачэння. Нягучна. Усё роўна як. Галоўнае цяпер: не хто вінаваты, а хто вырашыць праблему. Адпускайце гэтага хлопца (Юрыя Палітыку. — ***Зв.***), калі ён не вінаваты, і мы ціха і спакойна вырашым гэтае пытанне. Але галоўнае — яно будзе вырашана», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

## Не трэба палітызаваць моўнае пытанне

Прадстаўнікі ўкраінскіх СМІ закранулі моўнае пытанне ў Беларусі. Яны звярнулі ўвагу на надпіс, які ўбачылі над уваходам у Палац Незалежнасці, — ён быў на рускай мове.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што надпіс на Палацы зроблены і на беларускай мове — з іншага боку. «Бо ў нас дзве дзяржаўныя мовы, якія маюць цалкам роўны статус, гэта рашэнне рэферэндуму, — падкрэсліў ён. — Гэта канстытуцыйная норма».

«Так, мы больш размаўляем на рускай мове, — пагадзіўся кіраўнік дзяржавы. — Аўстрыйцы таксама размаўляюць на нямецкай, але не сталі немцамі. Такіх прэцэдэнтаў шмат. Я тут асаблівых праблем не бачу, але на стадыі самавызначэння, напэўна, гэта ўсё ж такі мае пэўнае значэнне».

Ён прапанаваў не параўноўваць у гэтым пытанні Украіну і Беларусь, бо нават у савецкія часы яны адрозніваліся. У Беларусі, на думку Прэзідэнта, моўнае пытанне не стаіць востра. «У нас няма боязі, што станем несуверэннымі, не незалежнымі па моўным прынцыпе. Размаўляем мы больш на рускай мове, часам з акцэнтам, але мову беларускую практычна ўсе ведаюць», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што апошнім часам шмат зроблена, каб пашырыць выкарыстанне беларускай мовы. Нямала, на яго думку, было зроблена і ў савецкія часы.

«Я заўсёды стараюся адыходзіць, калі вельмі палітызуецца гэтае пытанне, каб не зрабіць яблыкам разладу рускую мову, — патлумачыў сваю пазіцыю Аляксандр Лукашэнка. — Не трэба ламаць насельніцтва і прымушаць размаўляць на той мове, на якой жадае ўлада. Нават калі ёсць падставы. На гэта патрэбны час. І ісці да гэтага трэба вельмі акуратна і спакойна. Інакш калі і перажывём, то атрымаем адваротны эфект».

Прэзідэнт упэўнены: калі тытульная мова не была страчана ў Савецкім Саюзе, яна не будзе страчана і цяпер.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Наконт вяртання Крыма

«Мне здаецца, не. Я веру, што, як кажа Прэзідэнт (Расіі. — ***«Зв.»***), гэтае пытанне закрытае сёння і назаўсёды. Пра гэта кажа і акуратны спакойны Лаўроў, і ўсё кіраўніцтва. Кансэнсус у расійскім грамадстве — няма такога пытання, дзе б расіяне так падтрымлівалі ўладу, як па Крыме», — адказаў Аляксандр Лукашэнка на пытанне наконт магчымасці вяртання Расіяй паўвострава Украіне.

На думку беларускага лідара, няма такой сілы, якая супраць жадання Расіі можа гэта зрабіць. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, нават калі ў Расіі прыйдуць да ўлады людзі, якія асуджаюць далучэнне Крыма, яны не вернуць яго Украіне. «Паверце, я ведаю, пра што кажу. Не ўяўляю, якія павінны быць абставіны, каб Расія адмовілася ад Крыма сама», — сказаў кіраўнік Беларусі.

## Наступны Прэзідэнт будзе абраны толькі народам

«Няма ў нас транзіту ўлады. Наш Прэзідэнт будзе абраны толькі народам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы пра магчымы транзіт улады. Ён заявіў, што будзе працаваць на гэтай пасадзе столькі, колькі людзі давяраюць. «І пакуль ёсць здароўе. Калі нездаровы, дык няма чаго сюды лезці. Галоўнае — здароўе і давер людзей», — лічыць ён.

Адказваючы на пытанне пра дзяцей, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Мае дзеці не пакутуюць на жаданне прэзідэнцтва — ні адзін, ні другі, ні трэці. Яны «наеліся» майго прэзідэнцтва».

У кіраўніка дзяржавы таксама пацікавіліся, ці змог бы на выбарах Прэзідэнта Беларусі перамагчы несістэмны кандыдат, умоўна кажучы, артыст.

«У нас зусім іншы падыход, трохі іншая рэчаіснасць. У нас сацыяльна арыентаваная эканоміка, мы не станем усё рэзаць на кавалкі і прыватызаваць, у нас няма алігархату, алігархічных кланаў, якія ўплывалі б на ўладу і, барані бог, на Прэзідэнта», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі ў аснове ўсяго ляжыць справядлівасць. Падсумоўваючы сказанае, Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што ў Беларусі пакуль немагчымы такі варыянт. Разам з тым ён падкрэсліў, што справа не ў родзе занятку — артыст або шоўмен, — а ў самім чалавеку. «Людзі прывыклі, ужо прывучаны ісці ад жыцця, глядзець, хто ён такі. Няма той сітуацыі, калі людзі, заплюшчыўшы вочы, могуць за кагосьці прагаласаваць, гэта немагчыма», — абмаляваў беларускі лідар сваё бачанне беларускіх выбаршчыкаў.

Прэзідэнт адзначыў, што Прэзідэнт Украіны Уладзімір Зяленскі — адукаваны і разумны чалавек і, нягледзячы на тое, што ніколі не быў звязаны з дзяржаўнай службай, калі ён захоча, то навучыцца неабходнаму.

***

Напрыканцы сустрэчы Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Журналісты павінны з'ехаць у добрым настроі: прыехаў і пытанне хоць задаў тое, што патрэбна, і склаў уражанне пра Прэзідэнта і беларуска-ўкраінскія адносіны. Гэта галоўнае для нас. Таму я вам вельмі ўдзячны за тое, што вы прыехалі, асабліва тым, хто не першы раз».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў і за тое, што ўкраінцы падтрымліваюць беларусаў, добра да іх адносяцца. «Гэта вялікая гарантыя таго, што Лукашэнка заўсёды будзе вашым чалавекам, — сказаў ён. — І ніколі не зробіць ніякай не тое што подласці — ніякіх дрэнных спраў у адносінах да блізкай нам з вамі Украіны».

**Марыя ДАДАЛКА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

## МЕРКАВАННІ

*Сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі ўкраінскіх СМІ была грунтоўнай і насычанай. Такі пункт гледжання выказаў журналістам* ***галоўны рэдактар украінскай газеты «Урядовий кур'єр» Сяргей БРАГА.***

Кіраўнік выдання назваў шчырай і адкрытай праведзеную размову, падчас якой былі закрануты самыя разнапланавыя тэмы, у тым ліку і вострыя палітычныя, эканамічныя. «Аляксандр Лукашэнка досыць добра інфармаваны пра сітуацыю ва Украіне, у яго свой погляд на гэта. І гэты погляд чымсьці адрозніваецца ад таго, які мы чакалі пачуць. У чымсьці ён нас пераканаў, у чымсьці не», — сказаў галоўны рэдактар.

Ён застаўся задаволены сустрэчай — «галоўнае, што з першых вуснаў пачулі аб пытаннях, якія нас хваляюць».

**Галоўны рэдактар тэлеканала «Україна» Юрый СУГАК** таксама станоўча ацаніў вынікі размовы: «Грунтоўна, такая магчымасць пагаварыць з Прэзідэнтам бывае нячаста».

Па словах **генеральнага дырэктара інфармацыйнага агенцтва «Укрінформ» Аляксандра ХАРЧАНКІ,** асаблівая каштоўнасць такіх сустрэч у магчымасці асабістых зносін. «Можна адчуць харызматычнага чалавека, чаго не зробіш на адлегласці, у тэлевізары», — растлумачыў ён.

Аляксандр Харчанка адзначыў узрушальную шчырасць беларускага лідара, яго ўменне «смачна» падаць сваю пазіцыю. «Шмат з якімі яго ацэнкамі мы нават можам не пагадзіцца. Але гэта настолькі самастойнае, глыбокае, асэнсаванае ім разуменне, што гэта выклікае вялікую павагу, нават калі ты з ім і не згодны», — рэзюмаваў ён.

Украінскія журналісты назвалі асабліва важнай сустрэчу напярэдадні Беларуска-ўкраінскага форуму рэгіёнаў у Жытоміры.

Надвор'е

# ПАСТОЙ, АПОШНЯЕ ЦЯПЛО

### У суботу моцныя ліўні, а на захадзе да плюс 20 градусаў

**На гэтым тыдні антыцыклон падарыў злёгку халоднае, але сонечнае надвор'е. І сёння ўдзень атмасферны ціск будзе павышаны, але паступова стане падаць, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторыгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Ды і ў суботу ўначы захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску, але па захадзе, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны надвор'е пачне фарміраваць сістэма атмасферных франтоў, якія ссоўваюцца з Заходняй Еўропы. Уначы будзе воблачна з праясненнямі, удзень пераважна воблачнае надвор'е. Уначы па захадзе, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі пройдуць дажджы. **Раніцай і днём месцамі моцныя дажджы.** Уначы і раніцай месцамі згусціцца слабы туман. Вецер паўднёвы, паўднёва-заходні, умераны, удзень парывісты. Мінімальная тэмпература паветра ўначы апусціцца да 1—8 цяпла, па ўсходзе ў асобных раёнах замаразкі да мінус 2 градусаў, максімальная тэмпература ўдзень ад плюс 10 да плюс 17 градусаў. А вось у заходніх раёнах у гэты час будзе значна цяплей: тэмпература паветра ўначы — у раёне плюс 9—11 градусаў, а ўдзень — ад 18 да 20 цяпла.

У нядзелю на надвор'е будуць уплываць атмасферныя франты, якія ссоўваюцца з Заходняй Еўропы. Будзе воблачна з праясненнямі, на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай слабы туман. Вецер паўднёва-заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы істотна павысіцца і будзе ад плюс 6 да плюс 12 градусаў, а максімальная ўдзень — 12—18 цяпла.

*Увага! Сіноптыкі папярэджваюць: у сувязі з пагрозай замаразкаў не варта пакідаць без укрыцця на палях выкапаную бульбу і караняплоды.*

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Цвітуць каштаны

**У ваколіцах Брэста зацвілі каштаны, а дзе-нідзе заўважаны і яблыневы цвет. Гэта не навіна для нашыхшырот, але ж вучоныя называюць такое цвіценне памылкай прыроды.**



Першы раз я пабачыла некалькі суквеццяў каштанаў больш за тыдзень таму на выездзе з Кобрына. А цяпер вось у сеціве паведамляюць, што каштан дружна зацвіў у Белавежскай пушчы, і ўжо заўважаныя яблыні ў квецені ў Жабінцы і Брэсце. Прырода нібы збілася з толку пасля засушлівага красавіка, неймаверна спякотнага ліпеня і цёплага ў першай палове верасня. Вось дрэвы і падумалі, што зноў вясна. Але ж, на думку вучоных, пасля паўторнай вегетацыі расліны ўвойдуць у стадыю спакою аслабелымі і не зацвітуць як след наступнай вясной. Бо ўсяму свой час.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Чулі?

# Названы самыя папулярныя краіны для адпачынку беларусаў

**Да Міжнароднага дня турызму, які адзначаецца сёння, апублікаваныя статыстычныя звесткі, якія сведчаць пра тое, што беларусы часцей за ўсё выбіраюць для адпачынку Егіпет, Турцыю, Украіну, Балгарыю і Расію. Таксама сярод краін — лідараў па ліку арганізаваных выездаў — Іспанія, Польшча, Грэцыя, Грузія і Чарнагорыя.**

Найбольшы рост наведванняў адзначаецца па такіх напрамках, як Егіпет (з 123,8 тыс. у 2017 годзе да 212 тыс. у 2018-м), Украіна (з 91,2 тыс. да 122,1 тыс. адпаведна), Грузія (з 6,6 тыс. да 16,4 тыс.). Менш сталі бываць грамадзяне Беларусі ў Балгарыі (49,8 тыс. супраць 62,4 тыс.), Польшчы (30,2 тыс. супраць 36,2 тыс.), Чарнагорыі (16,2 тыс. супраць 19,4 тыс.). У Турцыі летась адпачыла 151,4 тыс., у Расіі — 47 тыс., Іспаніі — 32,2 тыс., Грэцыі — 28,1 тыс. турыстаў.

У цэлым выязны турыстычны паток з Беларусі з улікам перасячэнняў дзяржаўнай граніцы на адкрытым беларуска-расійскім участку ў 2018 годзе склаў 9,3 млн чалавек. Арганізавана выехала за мяжу 850,7 тыс. грамадзян.

Геаграфія наведванняў налічвае 123 краіны свету. У тым ліку тэрытарыяльна аддаленыя (больш за 8 тыс. км) Сент-Люсія, Панама, Ангілья, Гватэмала, Уганда, Гана, востраў Буве. Сярэдняя працягласць знаходжання беларускіх турыстаў за мяжой склала 8 дзён.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Іран прапанаваў краінам Персідскага заліва аб'яднацца ў кааліцыю надзеі



Пра гэта заявіў прэзідэнт Ірана Хасан Раўхані падчас выступлення на 74-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. «Я запрашаю ўсе краіны, якія наўпрост закранае сітуацыя ў Персідскім заліве, у кааліцыю надзеі», — сказаў ён. Прэзідэнт удакладніў, што «задачай гэтага саюза будзе прасоўванне міру, стабільнасці і дружалюбных адносін паміж яго членамі». Паводле слоў Раўхані, «кааліцыя будзе створана на базе прынцыпаў і задач ААН, пры ўмове дыялогу, павагі суверэнітэту іншых краін, прызнання міжнароднага заканадаўства, адмовы ад агрэсіі і неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых краін». Прэзідэнт Ірана падкрэсліў, што «бяспека рэгіёну павінна забяспечвацца без амерыканскіх войскаў і зброі». «ЗША правалілі спробы справіцца з выклікамі ў Афганістане, Іраку і Сірыі. Такая дзяржава не можа вырашаць складаныя [рэгіянальныя праблемы]», — сказаў ён, дадаўшы, што асноўнай умовай пачатку Тэгеранам перагавораў з Вашынгтонам з'яўляецца адмена санкцый і вяртанне да ядзернай здзелкі.

### Кіраўніком МВФ абраная Крысталіна Георгіева



На пасаду дырэктара-распарадчыка Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) на пяць гадоў абраная кандыдат ад Еўрасаюза Крысталіна Георгіева. Прадстаўніца Балгарыі раней была членам Еўракамісіі, а апошнім часам — выканаўчым дырэктарам Сусветнага банка. Георгіева, якая стане першым у гісторыі МВФ кіраўніком з краіны з эканомікай, якая развіваецца, уступіць на пасаду з 1 кастрычніка, адзначаецца ў паведамленні фонду. У пачатку верасня Савет кіраўнікоў МВФ зняў любыя ўзроставыя абмежаванні для пасады дырэктара-распарадчыка. Да гэтага кіраўніком фонду не мог стаць чалавек ва ўзросце 65 гадоў і старэйшы, а ўжо абраны дырэктар не мог працягваць работу пасля 70-годдзя. Зняўшы ўзроставыя абмежаванні, МВФ адкрыў дарогу да пасады 66-гадовай Георгіевай. Месца дырэктара-распарадчыка МВФ стала вакантным пасля таго, як Крысцін Лагард склала з сябе паўнамоцтвы з-за вылучэння на пасаду старшыні Еўрапейскага цэнтральнага банка. У пераходны перыяд абавязкі дырэктара выконваў першы намеснік Лагард амерыканец Дэвід Ліптан.

### Нетаньяху даручана сфарміраваць урад Ізраіля



Прэзідэнт краіны Рэўвен Рыўлін прыняў такое рашэнне пасля кансультацый з дэпутатамі кнесета. Раней лідар левацэнтрыстаў і галоўны сапернік Нетаньяху Бені Ганц адхіліў прапанову стварыць урад шырокага адзінства, адзначыўшы, што не ўвойдзе ў кааліцыю з палітыкам, супраць якога выстаўлены сур'ёзныя абвінавачванні: на 2 кастрычніка прызначаны дасудовыя слуханні па справах аб карупцыі і злоўжыванні з удзелам прэм'ер-міністра. На фарміраванне новага кабінета міністраў у Нетаньяху 42 дні. Яго падтрымліваюць 55 дэпутатаў парламента, Бені Ганца — 54. Для фарміравання кааліцыі патрэбны па меншай меры 61. 8 месцаў у кнесеце атрымала партыя «Наш дом — Ізраіль» Авігдора Лібермана, але ён адмаўляецца далучацца як да правага кабінета Нетаньяху з-за ўдзелу ў ім ультраартадаксальных партый, так і да магчымай цэнтрысцкай кааліцыі Ганца, якую падтрымліваюць дэпутаты ад «Аб'яднанага арабскага спіса».

# «Дзе б я ні быў, заўсёды хачу дадому»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адзін з іх нават паспеў стаць мільянерам... Але, вядома, мы ўжо не можам называцца сябрамі. У мяне да іх, дарэчы, ніякіх прэтэнзій, я ні на каго не злуюся. У іх сваё жыццё, і ніхто нікому нічога не павінен. І дзяржава нам нічога не павінна. Хоць многія калясачнікі лічаць, што дзяржава павінна іх утрымліваць. Але я думаю, што кожнаму трэба самому на сябе зарабляць, — або жыві на пенсію і не скуголь. Калі нехта стаіць з працягнутай рукой — значыць, яго да гэтага давяло жыццё. Я і гэтых людзей не асуджаю. Як не асуджаю тых, хто налажыў на сябе рукі. У мяне былі знаёмыя, якія прадалі тут кватэру і з'ехалі ў Галандыю на эўтаназію. Я не асуджаю іх рашэнне. Гэта мае правілы жыцця: нікога не асуджаць, і ніхто нікому нічога не павінен.

Па адукацыі наш герой, дарэчы, псіхолаг (скончыў Міжнародны гуманітарны эканамічны інстытут). «Я параўноўваў потым, калі вучыўся, тэорыю з практыкай: тыя пяць стадый прыняцця гора, як мы вучылі, — адмаўленне, гнеў, кампраміс, дэпрэсія і прынянцце — я ўсе іх калісьці прайшоў, — кажа ён. — Спачатку не мог да канца паверыць у тое, што здарылася. Усё здавалася, вось прачнешся наступнай раніцай — устанеш і пойдзеш. Потым пачынаеш думаць: чаму гэта здарылася са мной? Пасля: хто вінаваты? І толькі далей: што рабіць? У мяне было шмат знаёмых, якія прымалі рашэнне сысці з жыцця. У мяне таксама часам з'яўляліся такія думкі, але я прыняў рашэнне жыць».

## Пабываў у Еўропе, Азіі, ЗША...

«Мяне выпісалі з бальніцы, прывезлі ляжачага ў Мінск, — апавядае Барыс Бачкоўскі. — Бацькі жылі ў кватэры на сёмым паверсе, ліфт хадзіў з другога паверха... Дактары мне сказалі, што я ніколі не змагу хадзіць. Мяне гэта ўскалыхнула — і я стаў узмоцнена займацца фізкультурай, каб рэабілітавацца. Ужо праз тры гады скончыў курсы кіравання і вадзіў машыну — «Запарожац», які тады інвалід мог купіць за паўцаны.

А ў 1988 годзе я пачаў займацца інваспортам. Ужо ў 1992 годзе стаў чэмпіёнам СНД па настольным тэнісе. У 1996-м захапіўся спартыўнымі танцамі. Маёй партнёркай была Вольга Цяцёркіна — студэнтка Універсітэта культуры па спецыяльнасці «харэаграфія», якая да таго часу была трохразовай чэмпіёнкай краіны па спартыўных танцах. Нас пазнаёміў кіраўнік Беларускага фонду дапамогі спартсменам-інвалідам Валерый Каламіец. А праз тры гады мы сталі чэмпіёнамі свету па спартыўных танцах».

Пяць гадоў доўжыўся іх танцавальны марафон. За гэты час яны станавіліся чэмпіёнамі Беларусі, прызёрамі Кубка свету ў Амстэрдаме, фіналістамі адкрытых чэмпіянатаў Германіі, Галандыі, Швецыі, Нарвегіі. Трыумфальным было іх выступленне ў японскім горадзе Макухары на чэмпіянаце свету па спартыўных танцах на інвалідных калясках...

Так што дзякуючы інваспорту наш герой пабываў у многіх краінах. Акрамя Еўропы, Азіі, два разы



быў у ЗША, прычым другі раз па запрашэнні амерыканцаў ездзіў чытаць курс лекцый.

— Я ганаровы грамадзянін горада Пенсакола, штат Фларыда, ЗША, — усміхаецца Барыс Ісакавіч. — Нядаўна адзін мой таварыш трапіў туды, быў у мэрыі і сказаў, што там вісіць мой партрэт. Мяне нават запрашалі туды на ПМЖ як ганаровага грамадзяніна. Але я адмовіўся. І ў Ізраіль была магчымасць з'ехаць жыць... Там бы, вядома, было прасцей у матэрыяльным плане. Але тут я ўжо рэалізаваўся, а ў іншай краіне з гэтым было б нашмат складаней.

Ды і дзе б я ні быў, я заўсёды хачу дадому. Ведаеце, у вайну тут загінулі практычна ўсе мае сваякі, у гета. Я з беларускіх яўрэяў, мае продкі жылі тут пачынаючы з XIV стагоддзя. Нешта ж тут іх трымала, што яны нікуды не з'ехалі. І вось мяне гэта нешта тут трымае, напэўна...

Барыс Бачкоўскі прызнаецца, што ўсюды, дзе ён браў удзел у спаборніцтвах і дзе былі немцы, — ён выбіраў іх сваімі сапернікамі і змагаўся з імі. «Я разумею, што яны такія ж інваліды, у мяне няма на іх крыўды, але проста таму, што немцы *(усміхаецца)*. Гістарычная памяць ува мне вельмі моцная прысутнічае»...

## Пазнаёміўся з будучай жонкай таксама дзякуючы спорту

З 1996 года наш герой працаваў у Беларускім фондзе дапамогі спартсменам-інвалідам. Цяпер ён — старшы інструктар-метадыст у сацыяльнай установе «Інвацэнтр» ГА «Беларускае таварыства інвалідаў» і выкладае ва Універсітэце фізічнай культуры на кафедры ЛФК.

Адукацыя псіхолага, дарэчы, яму вельмі дапамагла. «Займацца рэабілітацыяй людзей з інваліднасцю бывае няпроста, — кажа ён. — Калі трэніраваць здаровых людзей, і тое бывае маса нюансаў у калектыве, здараюцца канфлікты. А людзі з інваліднасцю вельмі ўразлівыя. Яны могуць быць залежныя ад надвор'я, ад таго, як, у якім стане раніцай усталі. Нават ад таго, як на іх паглядзелі... А потым, калі з'яўляюцца вынікі, пачынаюцца поспехі, — у іх таксама можа здарыцца зорная хвароба, як і ў здаровых. Гэта тыя ж самыя людзі, толькі ў іх ёсць інваліднасць, а мазгі тыя ж самыя. У любога чалавека, калі ў яго з'яўляюцца нейкія дасягненні і ён бачыць, што ім ганарацца, ідзе ўверх самаацэнка».

***

І ў асабістым плане ў яго ўсё добра. Барыс Ісакавіч жанаты, нядаўна яны з жонкай адзначылі 30 гадоў сумесна праведзенага жыцця. Пазнаёміліся таксама дзякуючы спорту. Жанна трапіла ў 16 гадоў у аўтакатастрофу і з таго часу перамяшчаецца на калясцы. І, дарэчы, яны — першая ў Беларусі сямейная пара, якая жыве зусім незалежна, без старонняй дапамогі, хоць абое — на інвалідных калясках. Сёння яна — чэмпіёнка краіны па лёгкай атлетыцы і настольным тэнісе сярод інвалідаў, паспяхова выступала ў хуткаснай яздзе на калясках. З адзнакай калісьці скончыла філалагічны факультэт БДУ. Так што яны абое — вельмі моцныя асобы.

**Святлана БУСЬКО.**

---

Для самых маленькіх

# ТАЯМНІЦЫ СВЕТУ — ПРАЗ КАЗКУ

**У сталічнай кнігарні «Дружба» Выдавецкі дом «Звязда» прэзентаваў кнігу «Базгулаг і поры года».**

Гэта казка азербайджанскай пісьменніцы Севіндж Нурукызы, якая апавядае аб прыгодах маленькага зайчыка. «Шэрае вушка» (менавіта так перакладаецца на беларускую мову «Базгулаг») яшчэ шмат чаго не ведае, але жадае раскрыць многія таямніцы свету. Зайчаня цікавіцца ўсім: калі прачынаюцца матылькі? Ці не хварэе яблынька, калі з яе асыпаюцца лісточкі? Як даведацца, што прыйшла вясна?



Выданне разлічана на дзяцей, таму ў кнізе шмат загадак і вершаў. Ацанілі цікавасць казкі вучні другіх-чацвёртых класаў сталічнай школы № 44. Разам з галоўным героем дзеці адгадвалі загадкі пра поры года і месяцы, прыдумвалі мянушкі ўласным выдуманым персанажам, слухалі ўрыўкі з казачнай гісторыі, а таксама выконвалі заданні на ўважлівасць. Самыя актыўныя атрымалі падарункі — кнігі казак ад старшыні культурна-асветніцкага грамадскага аб'яднання «Габустан» Балдадаша Ганбарава, які і прэзентаваў кнігу Севіндж Нурукызы.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

---

Сугучча

# «ГРУНВАЛЬДСКУЮ БІТВУ» ПЕРАКЛАДУЦЬ НА ЎКРАІНСКУЮ

**Наладжаныя кантакты і канкрэтныя дамоўленасці сталі вынікам удзелу беларускай дэлегацыі ў 26-м Форуме выдаўцоў у Львове. У перыяд з 18 да 22 верасня стэнд нашай краіны прадставіў ва ўкраінскім горадзе каля двухсот найменняў кніг, арганізаваў прэзентацыі некалькіх новых айчынных выданняў, а таксама правёў перамовы з украінскімі калегамі.**

Беларускія кнігавыдаўцы і кнігараспаўсюджвальнікі паехалі ў Львоў, каб прадставіць выдадзеныя ў 2018-2019 гадах кніжныя навінкі і наладзіць сувязі ў сферы кнігавыдання і паліграфіі. Па словах удзельнікаў дэлегацыі, беларускі стэнд ад пачатку карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод наведвальнікаў, бо і цікавасць да самога форуму, адной з галоўных львоўскіх культурных падзей гэтага перыяду, аказалася высокай.

Прадстаўнікі беларускіх выдавецтваў атрымалі прапановы аб набыцці аўтарскіх правоў і выданні кніг на тэрыторыі Украіны. Выдавецтва «Беларусь» дамовілася аб перакладзе на ўкраінскую мову некалькіх сваіх выданняў, у прыватнасці «Грунвальдская бітва» Яна Длугаша і «У засенні замкаў і палацаў» Барыса Лазукі. Па словах дырэктара выдавецтва Сяргея Пешына, які акрэсліў прадукцыю «Беларусі» як «даволі спецыфічную літаратуру, прызначаную для ўнутранага спажывання», цікавасць да яе была значна вышэйшая, чым можна было чакаць: «Ні адна кніга не засталася без увагі. Мы блізкія народы, у нас блізкія мовы, і гісторыі нашы ўвесь час пераплятаюцца, таму было цікава пагладзець, іс спрацуе гэты агульны гістарычны код».

Атрымліваецца, на форуме, у якім, між іншым, удзельнічала больш за трыста выдаўцоў і на якім было прадстаўлена больш за дзве тысячы кніжных навінак, «агульны код» спрацаваў.

**Вольга МІЦКЕВІЧ.**

# ЯКІЯ КНІГІ НАБЫВАЮЦЬ У «БЕЛСАЮЗДРУКУ»?

**Апошнім часам паступова развіваецца кнігагандаль у сістэме «Белсаюздруку» па горадзе Мінску. Якія ж кнігі і аўтары трымаюць пазіцыі лідараў па зацікаўленнях пакупнікоў?**

Самай папулярнай у 2019 годзе стала кніга, прысвечаная Правілам дарожнага руху і мерам адказнасці за іх парушэнні (выдавец — Рэгіянальны цэнтр прававой інфармацыі Мінска) — яе за восем месяцаў набылі ў колькасці 2969 (!) асобнікаў. Дарэчы, на другім і трэцім месцах таксама ў лідарах — кнігі аб правілах дарожнага руху. Толькі ўжо іншыя выданні. На чацвёртым і пятым месцах — казкі «Два сквапныя медзведзяняці» і «Як звяры суп варылі» (адпаведна 576 і 557 асобнікаў набылі сёлета пакупнікі кіёскаў, павільёнаў у горадзе Мінску). Выдавец казак — «Харвест». З дзяржаўных выдаўцоў у сотню лепшых па рэйтынгу найпродажаў трапіла ўсяго толькі сем пазіцый Паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа. Разнова, зразумела, пра выданні казак. Верхняе месца ў «коласаўцаў» — 38-е (247 асобнікаў «Вячэрніх казак»), ніжняе — 63-е (прададзена 183 асобнікі «Дзядулевых казак»).

На жаль, у рэйтынгу са 100 назваў кніг не знайшлося месца кнігам сучасных беларускіх пісьменнікаў, ды і кнігам беларускіх класікаў — таксама.

Гэта не значыць, што кнігі беларускіх выдавецтваў у «Белсаюздруку» не купляюць зусім. Рэйтынг складзены ў дачыненні да 100 кніг, якія найболей прадаюцца. Ніжнюю пазіцыю ў ім займае кніга, прададзеная ў колькасці 85 асобнікаў. А калі гаварыць аб працэнтных суадносінах па аб'ёме агульных продажаў (гэта значыць — з улікам і тых назваў кніг, якіх прадалі меней, чым 85 экзэмпляраў), то ў дзясятку найболей руплівых распаўсюджвальнікаў кніг у «Белсаюздруку» ўвайшло і выдавецтва «Беларусь» (восьмае месца: 3,2 працэнта ў агульных продажах). На 12-м месцы — «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», на 13-м — Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа, на 16-м — Выдавецкі дом «Звязда», на 17-м — «Пачатковая школа».

Лічбы, як кажуць, заўсёды красамоўныя. А высновы, пэўна, варта рабіць выдаўцам. Калі, вядома, яны дбаюць пра чытача, пакупніка кніг.

**Сяргей ШЫЧКО.**




## Не еўшы ляжаш...

Той калгас з гучным імем Чкалава быў заўжды ў ліку першых — на жаль, ад «хваста», бо землі там неўрадлівыя — пясок ды падзол, балоты непралазныя, а сенажаць і ўвогуле ў пойме Прыпяці за дзесяць вёрст: у касавіцу людзі мусілі ездзіць туды з начлегам, на некалькі дзён. Спачатку нарыхтоўвалі сена для калгаснага статка і толькі потым (пад канец жніўня, а то і ў верасні) касілі атаву для сваіх Зорак ды Мілак...

Тыя тры дзяцькі — калгаснікаў Змітрака і Максіма ды настаўніка гісторыі Аляксандра Іванавіча — былі побач. Мужчыны дружна, гуртам працавалі, гуртам начавалі — вядома ж, павячэраўшы...

Той раз ежы было як кот наплакаў: у Максіма акраец хлеба ды кавалачак сала, у Змітрака з гісторыкам — сем яек на дваіх... Хоць-нехаць ім даваліся пайсці ў найбліжэйшую вёску — пазычыць у родзіча так званай блытанкі, каб налавіць рыбы...

Трэба сказаць, што яе ў гэту сетку трапляла шмат, не толькі вялікай, але і малой... Таму, баючыся рыбнагляду, Змітрок з гісторыкам доўга шукалі зацішнае месца — «хавалі» блытанку ад чужых вачэй...

Калі вярнуліся да месца начлегу, Максім ужо прыстараўся сухога ламачча, расклаў вясёлае вогнішча, набраў у кацялок вады, каб зварыць яйкі. А пакуль мужчыны курылі ды вялі няспешную гамонку.

...Рэч у тым, што гісторык быў паляўнічы і аднойчы яму вельмі пашчасціла — ён забіў ваўка. Гісторыю пра гэта ведала ўся акруга, але Іванавіч усё роўна яе расказваў. І Цэзара тады купіў — паляўнічага сабаку, хоць жонка ў гэта і не верыла. Казала: «Яшчэ адзін дармаед! Дварняк — чысцейшай вады! Цюлька!..»

Дзецям гісторыка новая мянушка для сабачкі спадабалася больш, а дармаеду ўсё роўна было, як клічуць, — абы частавалі... Праўда, з узростам у ім прачнуліся нейкія гены: у той надвячорак у пошуках ежы ён, напрыклад, абшнарыў усё і, нічога, на жаль, не знайшоўшы, таксама сядзеў ля вогнішча — разам з касцямі чакаў вячэры.

Такім чынам, да яе штосьці нешта ўжо варылася; гісторык апавядаў гісторыю пра ваўка, а Максіму нецікава было, таму ён моўчкі палез у курэнь — хацеў перад вячэрай трохі паляжаць: яйкі ж не хутка зварацца? А юшка — і пагатоў, бо яшчэ ж і рыба ў рацэ.

Змітрок з гісторыкам пайшлі паглядзець, як яна там. Клікалі з сабой і сабаку, але ён чамусьці не пайшоў, чым засмуціў... А вось блытанка — тая наадварот — парадавала, бо ў ёй срэбнай луской пабліскала рыба. І раптам...

— Пах! Пах-пах! — данеслася да рыбакоў.

— Рыбнагляд? — спалохаліся яны.

— Сетку ў ваду! — скамандаваў Іванавіч, і мужчыны, адбегшыся ад берага, палеглі на зямлю.

— Куля ж дурніца, — з веданнем справы казаў гісторык, — яна ж не глядзіць, куды ляціць.

...Калі стральба такі сціхла, касцы вярнуліся на бераг, але блытанкі там ужо не было: сплыла — разам з рыбай. Мужчыны — галодныя і злыя — папляліся да вогнішча, вакол якога не ў лепшым настроі мітусіўся Максім:

— Па рыбу пайшлі! — «мацюкамі мацюкаўся» ён. — А яйкі вам што — ужо лішнія? Ці не ежа?! Іх трэба на сабаку пакінуць?.. Усе пастралялі! Усе разляцеліся!.. Няма чаго есці!.. Што — і рыбы няма?!

— Блытанкі таксама, — уздыхнуў Змітрок.

— Давайце тады хоць сала з'ямо, — прапанаваў гісторык і тут жа ўбачыў, як Цэзар падціснуў хвост і вінавата сігануў у кусты. Было з чаго: кайстра, у якой ляжаў апошні прыпас, валялася непадалёк і была абсалютна пустой.

Таму па сабакі ноч, вядома ж, не здоўжылася, а вось для мужчын...

Праўду кажуць: не еўшы ляжаш, не спаўшы ўстанеш.

**Ніна Кандрашонак,**
*г. Петрыкаў.*

## Конік? Добра,
## а тэхніка ўсё-такі лепш

Восень... Людзі шчыруюць на сваіх палетках, збіраюць апошні ўраджай. Якраз пра яго і мая гісторыя.

Было гэта ў тыя часы, калі пад бульбу выдзяляліся адмысловыя надзелы. У нас, напрыклад, калгаснікам давалі па 45 сотак зямлі, работнікам лясгаса — па 25, а настаўнікам — па 15. Такія былі «законы».

Дык вось у тую вясну два швагры (адзін з іх — мой сябар Міша) атрымалі па такой «палосцы» ды сталі думаць, як на іх бульбу садзіць. Пад каня — як заўсёды? Але ж узяць яго можна толькі тады, калі скончыцца пасяўная ў калгасе... Дык, можа, не чакаць?

Міша, помню, пайшоў да брыгадзіра, папрасіў саджалкі і яму не адмовілі (праўда, папрасілі, каб тры дні адпрацаваў)... Жонка з гэтым згадзілася, а вось цешча — тая сапраўдны лямант узняла: ты што, маўляў, з глузду з'ехаў? Пад каня шырыня паміж градкамі 30 сантыметраў, а пад трактар — 70... Ды так жа палова зямлі прагуляе...

Міша, аднак, прыняў рашэнне і нікога болей не слухаў — пасадзіў бульбу саджалкай.

А вось другі зяць той самай цешчы зрабіў, як яна сказала: пасадзіў пад каня. Надзелы гэтых шваграў былі паблізу, таму дзён праз колькі на Мішавай палосе зазелянелі ўсходы, а ў Івана яны толькі паказаліся. Ды і потым Міша даглядаў свае пасадкі з дапамогай тэхнікі, а Іван — з канём ды з матычкай.

І вось прыйшла восень — пара выкопваць бульбу. Іван разам з жонкай і цешчай упіраўся дзён з пяць, Міша справіўся за дзень.

— Усю бульбачку ў зямлі пакінуў, — сварылася цешча.

І зяць не вытрымаў: папрасіў трактарыста «прайсціся» капалкай — і па сваім надзеле, і па Іванавым. На яго полі дзе-ніздзе маленькія бульбінкі, а ў Івана — не абабрацца, як той казаў.

— Пазбіраеце? — спытаў Міша ў цешчы.

— А як жа, — згадзілася тая і вечарам прызналася, — у Івана сабрала цэлы мяшок, а ў цябе — і вядра няма: усё... у зямлі засталося!

...Карацей, Міша сваёй цешчы нічога не давёў, але ж бульбу стаў садзіць толькі з дапамогай тэхнікі.

Цяпер, згадзіцеся, гэта ўжо звыклая справа, а некалі ж давялося ваяваць.

Хоцьсабе і з цешчай.

**В. М. Пяшэвіч,**
*в. Юркевічы, Жыткавіцкі раён.*

## «А галоўнае — гэта швабра...»

Мая гісторыя — пра маю блізкую прыяцельку, пра Веру, якая гадоў з 20 вучыла дзяцей роднай мове. Прычым размаўляла на ёй не толькі на ўроках: Верыну беларускую — чыстую, прыгожую — людзі з асалодай слухалі (і, дзякаваць богу, слухаюць!) у крамах, на рынках, у грамадскім транспарце, а ўжо ў школе, на бацькоўскіх сходах...

Праўда вось, гэта было даўно, да таго, як медыкі «прапісалі» ёй іншую работу — куды спакайнейшую. Вера доўга шукала яе і такі знайшла: адзін з былых вучняў прапанаваў «пасаду» вахцёра. Грошай, праўда абяцаў няшмат, што настаўніцу, вядома, засмуціла, але з іншага боку, былі так званы сацпакет і зручны графік. Да таго ж фірма — за нейкі кіламетр ад дому. Так што новай вахцёрцы — замест зарадкі — пехатою можна туды, пехатою назад...

Карацей, Вера згадзілася: хутка пазнаёмілася з людзьмі, развяла вазоны, час ад часу стала дапамагаць пажылой прыбіральшчыцы: з мяне ж, маўляў, карона не зваліцца...

Мусіць, таму аднойчы да яе падышла заклапочаная кадравічка, нясмела сказала, што на прадпрыемстве, дзе іх фірма здымае памяшканні, захварэла прыбіральшчыца, падмяніць няма каму. І так кабінеты не кінеш, бо там — начальства... «Дык, можа б, вы, Верачка Сямёнаўна...»

— Мне ж заплацяць? — спытала тая.

— Само сабою!.. Калі вы не супраць, вам зараз пакажуць «участак», скажуць, дзе інструмент, і назаўтра...

Назаўтра Вера Сямёнаўна прыйшла на работу загадзя. Па-настаўніцку добрасумленна прыбрала ў кабінеце дырэктара, яго намеснікаў, галоўнага інжынера. І далей — па парадку: у дыспетчарай, забеспячэнцаў... Замарылася, але ж заставаўся толькі пусты калідор — яна дамывала апошнія метры.

А тым часам і людзі пайшлі... Першымі — два мужчыні.

**КАЗЯРОГ.** Каб паспяхова рухацца наперад, трэба забыць пра сумневы і комплексы. Нават самыя экстравагантныя ідэі знойдуць станоўчы водгук, а таксама могуць прынесці нечаканыя вынікі. У аўторак не выяўляйце адкрыта сяброўскіх пачуццяў, хоць вас і пацягне на гэта. Не спяшайцеся ажыццяўляць задуманае, не прадумаўшы дробязяў.

**ВАДАЛІЎ.** Карысна будзе падвесці пэўныя вынікі і ўзгадаць, хто і што для вас з'яўляецца значным. Крытычнасць і прынцыповасць — зусім не тыя якасці, якія павінны выкарыстоўвацца ў абставінах, што склаліся. Вучыцеся не толькі слухаць, але і чуць, не паддавайцеся імгненнаму імпульсіўнаму парыву. Таварыскасць дазволіць наладзіць новыя карысныя кантакты. У асабістым жыцці магчымыя сумненні і рэўнасць. Не рвіце адносіны на хвалі негатыўных эмоцый — разбярыцеся ў сітуацыі.

**РЫБЫ.** Давядзецца рабіць тое, што трэба, а не тое, што хочацца. Неабходна шукаць кампраміс. Сябры засыплюць парадамі дыяметральна процілеглага зместу. Спрабавацьіх прытрымлівацца, зразумела, не варта, але выслухаць можна — раптам праслізне і разумная думка. Будзьце адкрыты для перамен, не адмаўляйцеся ад новых магчымасцяў. Вашы працоўныя подзвігі не застануцца незаўважанымі. У пятніцу пажадана крытычна ацэньваць свае дзеянні і словы, гатовыя сарвацца з языка.

## Даты Падзеі Людзі

**27 ВЕРАСНЯ**

**У краіне**

**1533** год — дзень нараджэння Стафана Баторыя, дзяржаўнага дзеяча, палкаводца, вялікага князя ВКЛ, караля польскага. У 1575 годзе стаў каралём Рэчы Паспалітай. У 1579-м пераўтварыў Віленскі езуіцкі калегіум у акадэмію (пазней — Віленскі ўніверсітэт), даў дазвол на заснаванне езуіцкіх калегіумаў у Полацку, Рызе. Імкнуўся да мірнага вырашэння ідэалагічных канфліктаў. Сваю рэзідэнцыю трымаў у Гродне. Памёр тут жа, у Гродне, у 1586 годзе.

**1903** год — нарадзілася (г. Бабруйск) Вера Захараўна Харужая, дзяячка рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Віцебскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, публіцыст. У 1942 годзе была арыштаваная і загінула ў фашысцкіх засценках.

**1909** год — нарадзіўся (вёска Скварцы, цяпер у Дзяржынскім раёне) Лукаш Калюга (Вашына Канстанцін Пятровіч), беларускі пісьменнік. У 1931 годзе скончыў Беларускі педтэхнікум. Працаваў у НДІ прамысловасці ВСНГ Беларусі, на Беларускім радыё. Аўтар апавесцяў «Ні госць ні гаспадар», «Нядоля Заблоцкіх», шматлікіх апавяданняў. На беларускую мову пераклаў паасобныя творы П. Панча, Ю. Алешы, Я. Гашака. У 1933 годзе рэпрэсаваны, расстраляны ў 1937-м. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

**1939** год — нарадзіўся (вёска Хмяльное Буда-Кашалёўскага раёна) Уладзімір Кірылавіч Саўчанка, вучоны ў галіне генетыкі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар. Аўтар больш чым 280 навуковых прац, у тым ліку 12 манаграфій, трох вынаходстваў. Навуковыя даследаванні ў галіне агульнай біялогіі, генетыкі і экалогіі. Арганізаваў Міжнародную чарнобыльскую экалагічную навуковую сетку ЮНЕСКА для міждысцыплінарных даследаванняў экалагічных наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1997** год — Крыж Ефрасінні Полацкай, які бясследна знік у гады Вялікай Айчыннай вайны і які знойгу быў адноўлены брэсцкім майстрам М. Кузьмічом, заняў сваё традыцыйнае месца ў Крыжа-Узвіжанскім саборы Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра.

**У свеце**

**1801** год — Аляксандру І прадстаўлены першы ў свеце ровар. Вынаходнікам першага ў свеце двухколавага ровара быў ураджэнец Прыкамскай зямлі Яфім Міхеевіч Артамонаў, прыгонны Пожвінскага завода. Жалезная «машына», пабудаваная на Ніжнетагільскім заводзе, мела выгляд двухколавай каляскі з педальным прыводам на пярэдняе кола і рулём. Пярэдняе кола было амаль у тры разы большае, чым задняе. Ровар прыводзіўся ў рух педалямі, якія сядзелі на восі пярэдняга кола. Канструкцыя самаката была настолькі трывалая, што майстар змог здзейсніць на ім нялёгкае падарожжа (з хуткасцю 10 км/г) ад Урала да Санкт-Пецярбурга на каранацыю Аляксандра І — (15) 27 верасня 1801 года. Вынаходніцтва так здзівіла ўсіх прысутных і самога імператара, што за стварэнне ровара Артамонаву з усімі яго нашчадкамі была падаравана свабода ад прыгоннай залежнасці. Гэты цуд тэхнікі затым папоўніў царскую калекцыю рэдкасцяў, пасля чаго пра яго забыліся.



## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.03 | 18.57 | 11.54 |
| Віцебск — | 6.53 | 18.46 | 11.53 |
| Магілёў — | 6.53 | 18.47 | 11.54 |
| Гомель — | 6.50 | 18.44 | 11.54 |
| Гродна — | 7.19 | 19.12 | 11.53 |
| Брэст — | 7.19 | 19.13 | 11.54 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 22 верасня.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**

*Пр. УЗВІЖАННЕ КРЫЖА ГАСПОДНЯГА. Івана.*
*К. Вінцэнта, Даміяна, Космы.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Тата ціхенька заходзіць у пакой, глядзіць, як пяцігадовы сын нешта робіць у камп'ютары. Стаў у яго за спінай і бачыць: у пошукавым радку браўзера малы піша:**

**«Як звольніцца з дзіцячага садка?»**

Калі жанчына ў рэстаране хоча заплаціць за сябе сама, то, хутчэй за ўсё, сексу ў вас не будзе...

**— Як вы выбіралі сваю будучую прафесію?**

**— Мама параіла.**

**— А як усяго дасягнулі?**

**— Тата дапамог.**

Крыўдна, калі ты ўся такая цішнеш мужыку на жаль, распавядаеш аб сваім цяжкім жыцці, а ў гэтага казла, аказваецца, няма грошай.



caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3137.

Нумар падпісаны ў 19.30 26 верасня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

27 верасня 2019 г. № 39 (524)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

## «ПУНКТЫ РОСТУ» РЭГІЁНАЎ

### У 11 гарадах краіны рэалізуюцца планы паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця




Інфаграфіка Аляксандра АСІПЕНКІ.

**Асноўная частка беларусаў на працягу ўжо многіх гадоў для жыцця выбірае гарады. Па даных Белстата, сёлета на 1 студзеня гарадское насельніцтва склала больш за 7 мільёнаў 400 тысяч чалавек, а сельскае ледзь пераадолела планку ў два мільёны. Разрыў у тры з паловай разы зразумелы — у буйных цэнтрах сфарміравана сацыяльна-эканамічная база, туды сцякаюцца інвестыцыі, ды і работу там знайсці лягчэй. Але гэтыя характарыстыкі ў большасці датычацца абласных цэнтраў. Тэмпы развіцця і магчымасці малых і сярэдніх гарадоў значна больш сціплыя. Улады паставілі перад сабой задачу — развіваць эканоміку рэгіёнаў і на гэтай аснове скарачаць разрыў у якасці жыцця насельніцтва. Акцэнт зроблены на 11 гарадах Беларусі з колькасцю насельніцтва больш за 80 тысяч чалавек, дзе ў найбліжэйшыя гады павінна быць забяспечана паскоранае сацыяльна-эканамічнае развіццё. У пералік рэгіёнаў, якім нададуць «другое дыханне», увайшлі Баранавічы, Пінск, Наваполацк, Орша, Полацк, Мазыр, Ліда, Барысаў, Салігорск, Маладзечна, Бабруйск.**

стар. 4

## Ад сацыяльнай сферы да развіцця вытворчай базы

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава пабывала з рабочай паездкай у Бабруйск, дзе сустрэлася з прадстаўнікамі мясцовых органаў улады, наведала шэраг прадпрыемстваў і азнаёмілася з сацыяльным жыццём горада, паведамляе БелТА.**

Наталля Качанава нагадала, што Бабруйск адносіцца да ліку 11 гарадоў з колькасцю насельніцтва больш за 80 тысяч чалавек, якія трапілі ў праграму апераджальнага развіцця. Яна адзначыла, што ў ранейшыя гады шмат увагі ўдзялялася развіццю аграгарадкоў, прывядзенню ў парадак абласных цэнтраў. «Цяпер прыйшоў час больш пільна зірнуць на такія гарады, дзе вялікая колькасць вытворчых сіл, дзе сканцэнтраваны вытворчасці, прадпрыемствы», — падкрэсліла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

стар. 3



Фота БелТА.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Нанатэхналогіі і сучаснасць



Навукоўцы, даследчыкі і спецыялісты разважалі, наколькі новыя матэрыялы ўплываюць на аблічча XXI стагоддзя. стар. 2

### Як застацца на рынку?



Выязная сесія Брэсцкага аблсавета разгледзела работу прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці. стар. 14

### Мадэлюем будучае



Як рэалізуецца трохгадовы план мясцовага эканамічнага развіцця ў Слаўгарадскім раёне? стар. 14

### Без абмежаванняў



У Гродне пачаў дзейнічаць першы спартыўны інклюзіўны цэнтр. стар. 15

### Свята ў хату!



Дрыбін запрашае ўсіх на сваё 450-годдзе, якое адзначаць у суботу, 28 верасня (+Святочная праграма). стар. 16

# ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ СЯБРОЎСКІХ АДНОСІН


sovrep.gov.by

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны па супрацоўніцтве з Індыяй Міхаіл Мясніковіч сустрэўся на мінулым тыдні з кіраўнікамі буйных індыйскіх кампаній: прадстаўнікамі бізнесу ў галіне машынабудавання і металургіі, харчовай прамысловасці, нафтаперапрацоўкі, транспарту і лагістыкі і іншых сфер. Яны ўваходзяць у склад Канфедэрацыі індыйскай прамысловасці.**

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што сустрэчы з дэлегацыямі Індыі, у тым ліку з прадстаўнікамі дзелавых колаў, набываюць сістэмны характар. Аснову для стратэгічнага партнёрства паклаў візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў Індыю, які адбыўся ў верасні 2017 года, паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі.

Праходзяць пасяджэнні беларуска-індыйскай міжурадавай камісіі, сумесныя бізнес-форумы. Выніковы быў візіт у Мінск дзяржаўнага міністра гандлю і прамысловасці Індыі. Падпісаны дагавор аб інвестыцыях, які фарміруе прававую аснову для больш актыўнага супрацоўніцтва.

«Хачу падкрэсліць, што паміж нашымі краінамі гістарычна высокі ўзровень сяброўскіх адносін і мы маем намер іх умацоўваць і развіваць, — заявіў Міхаіл Мясніковіч. — Ёсць высокая ступень узаемаразумення на палітычным узроўні, у гандлёва-эканамічных адносінах, і, безумоўна, у гуманітарным супрацоўніцтве».

Тавараабарот паміж Беларуссю і Індыяй у першым паўгоддзі 2019 года вырас у 1,5 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. І гэта не мяжа, упэўнены Міхаіл Мясніковіч. На яго думку, у дзвюх краін калασальны патэнцыял у сферы бізнес-супрацоўніцтва. Добрыя прыклады такога ўзаемадзеяння ўжо ёсць. Сумесныя праекты рэалізуюцца з удзелам беларускіх прадпрыемстваў «БелАЗ», «Белкамунмаш», «Гомсельмаш». Індыйскія інвестары інвестуюць у праекты па стварэнні сучасных фармацэўтычных вытворчасцяў у Беларусі. «Выдатна, што пры гэтым адпрацоўваюцца новыя бізнес-мадэлі, калі ідзе спалучэнне гандлёвага і інвестыцыйнага кампанентаў», — адзначыў спікер Савета Рэспублікі.

Міхаіл Мясніковіч прапанаваў абмеркаваць далейшыя перспектывы двухбаковага партнёрства. «Хацеў бы, перш за ўсё, пачуць вашу думку аб магчымай актывізацыі ўзаемадзеяння па інвестпраектах у асаблівай эканамічнай зоне «Брэміна-Орша». Мы стварылі там дастаткова камфортныя прававыя ўмовы і разлічваем на тое, што індыйскі бізнес будзе больш актыўны ў гэтым праекце, — дадаў Міхаіл Мясніковіч. — Ці хацелі б, каб гэта быў беларуска-індыйскі кластар, у першую чаргу інвестыцыйны».

Развіццю інвестыцыйнага партнёрства павінен садзейнічаць Беларуска-індыйскі інвестыцыйны форум, які пройдзе ў Індыі да канца бягучага года.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама паведаміў, што прапрацоўваецца пытанне аб візіце ў Беларусь прэм'ер-міністра Індыі Нарэндры Модзі ў 2020 годзе. «Мы сур'ёзна рыхтуемся да гэтай знакавай сустрэчы», — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу кіраўнік індыйскай дэлегацыі, дырэктар кампаніі «Баджадж Індастры» Панкадж Баджадж адзначыў выніковасць беларуска-індыйскага супрацоўніцтва. «Мы праводзілі сустрэчы летась і бачым, што ўсё, аб чым дамаўляліся, выконваецца. Мы таксама са свайго боку стараемся выканаць дамоўленасці. І гэта дае вынікі — расце гандаль, з'яўляюцца інвестыцыйныя праекты. Зараз адносіны Індыі да Беларусі даволі ўважлівыя. Мы чакаем, што вынікі будуць яшчэ лепшыя», — заявіў ён.

Асаблівую ўвагу кіраўнік дэлегацыі аддаў пастаўкам беларускай кар'ернай тэхнікі ў Індыю. «БелАЗ» выйграў тэндар і пастаўляе ў Індыю сваю тэхніку. Гэта, безумоўна, вялікі прарыў і вялікі поспех» — адзначыў ён. Панкадж Баджадж таксама праінфармаваў аб планах індыйскіх кампаній адкрыць вытворчасці ў асаблівай эканамічнай зоне «Брэміна-Орша».

Першы намеснік міністра адукацыі Беларусі, член Савета Рэспублікі Ірына Старавойтава ў інтэрв'ю журналістам паведаміла, што цяпер прапрацоўваецца пытанне аб стварэнні ў Індыі беларускага цэнтра прафесійна-тэхнічнай падрыхтоўкі. Беларусь мае для гэтага развітую базу, моцны прафесарска-выкладчыцкі склад і адпаведныя праграмы. Гаворка ідзе пра падрыхтоўку кадраў на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі для перспектыўных сфер індыйскай эканомікі.

СЕМІНАР

# Нанатэхналогіі вызначаць аблічча XXI стагоддзя



**Сёння ў Мінску завяршае работу трохдзённы беларуска-індыйскі семінар «Нанаматэрыялы і новыя матэрыялы». Ён праходзіць на базе дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут парашковай металургіі імя акадэміка А. У. Романа».**

Насычаная і актуальная праграма сустрэчы выклікала вялікую цікавасць у вядучых навукоўцаў, даследчыкаў і спецыялістаў. І не толькі ў іх. Інтарэс, зразумела, праявілі і арганізатары навуковага працэсу з Індыі і нашай краіны, яе кіраўніцтва. Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, упаўнаважаны па супрацоўніцтве з Індыяй доктар эканамічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхаіл Мясніковіч уважліва сочыць за стасункамі навукоўцаў і дзелавых колаў абедзвюх краін. Як асоба, якая даўно ў тэме размовы, Міхаіл Уладзіміравіч адразу пачаў з галоўнага: адзначыў гістарычна высокі ўзровень сяброўскіх адносін Беларусі і Індыі, высокую ступень узаемаразумення беларускага і індыйскага народаў, плённае палітычнае ўзаемадзеянне паміж Мінскам і Дэлі.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў, што існуе трывалая арганізацыйная і прававая база для паспяховай работы, дзейнічае сумесная камісія ў галіне навукі і тэхнікі, рэгулярна праходзяць яе пасяджэнні. Міхаіл Мясніковіч у цэлым станоўча ацаніў развіццё міжпарламенцкіх сувязяў, вынікі эканамічнага супрацоўніцтва, ход рэалізацыі міжурадавага пагаднення.

Цяпер у стадыі рэалізацыі знаходзяцца тры інвестыцыйныя праекты ў сферы фармацэўтыкі, таксама шмат гуманітарных і адукацыйных праектаў. Іх спіс пастаянна папаўняецца. Ён таксама адзначыў, што індыйскія інвестары давяраюць беларускім партнёрам.

Міхаіл Мясніковіч нагадаў: два апошнія дзесяцігоддзі сталі стратэгічным індустрыяльным кірункам развіцця нанатэхналогіі. А за ўнікальныя вынікі даследаванняў у галіне нанатэхналогій і нанаэлектронікі, нанаматэрыялаў былі прысуджаны шэсць Нобелеўскіх прэмій. Менавіта развіццё нанатэхналогій вызначыць аблічча XXI стагоддзя.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама ўхваліў стварэнне Сумеснага цэнтра дэманстрацыі тэхналогій на базе Цэнтра ў Хайдарабадзе. Ва ўрадзе і парламенце Беларусі гэта ідэя актыўна падтрымліваецца, бо такі цэнтр можа стаць ключавым навуковым і інфраструктурным міжнародным беларуска-індыйскім праектам, выказаў упэўненасць Міхаіл Мясніковіч.

А як усё некалі пачыналася? Індыйскія і беларускія навукоўцы з пэўнай доляй здзіўлення казалі пра тое, што пачаткам плённага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва стала сапраўды лёсаносная камандзіроўка ў Індыю таленавітага беларускага вучонага прафесара Алега Романа напрыканцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя. Там ён з поспехам на працягу двух гадоў чытаў лекцыі ў адной з тэхнічных ВНУ краіны. Алег Уладзіслававіч літаральна зачараваў індыйскіх калег сваім бачаннем вялікіх перспектыў выкарыстання тэхналогій парашковай металургіі. Потым прафесар Роман стаў лаўрэатам міжнароднай прэміі імя Джавахарлала Нэру ў 1992 годзе, міжнароднай прэміі Індыйскай асацыяцыі парашковай металургіі. У 2002 годзе на канферэнцыі Нацыянальнай асацыяцыі індыйскіх інжынераў у Дэлі Алега Романа прызналі найлепшым замежным навукоўцам 2000 года. Менавіта ён з'яўляецца ініцыятарам стварэння ў Індыі цэнтра парашковай металургіі.

Так з лёгкай рукі беларускага вучонага завязаліся кантакты, распачаліся сумесныя праекты, узаемныя візіты. Вось і цяпер у Мінск прыехала прадстаўнічая дэлегацыя з Індыі. У яе складзе прадстаўнікі вядучых навуковых арганізацый гэтай краіны: Міжнароднага цэнтра перспектыўных даследаванняў парашковай металургіі ARCI, Індыйскага тэхналагічнага інстытута, Хайдарабадскага ўніверсітэта, Цэнтра матэрыялаў для электронных тэхналогій (C-MET), Індыйскага тэхналагічнага інстытута Бамбея, Нацыянальнай фізічнай лабараторыі CSIR-NPL з Нью-Дэлі і Тэхналагічнага каледжа PSG.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Калі меркаваць па водгуках гасцей, то яны задаволены вынікамі сустрэч з беларускімі калегамі ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і ў Міністэрстве адукацыі. І, зразумела, у Інстытуце парашковай металургіі, які сёння ўяўляе шматпрофільную міжгаліновую навуковую арганізацыю. Яго супрацоўнікі займаюцца распрацоўкамі, даследаваннямі і выкарыстаннем новых матэрыялаў у галіне парашковай металургіі, кампазіцыйных і звышцвёрдых матэрыялаў, ахоўных пакрыццяў, зваркі, імпульсных тэхналогій, у тым ліку зваркі выбухам.

Мэта семінара — абмеркаваць перспектыўныя кірункі даследаванняў у галіне нанаматэрыялаў, нанатэхналогій і новых матэрыялаў, усталяваць новыя, развіць і ўмацаваць ужо існуючыя сувязі паміж навуковымі і навучальнымі арганізацыямі Беларусі і Індыі — была дасягнута.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# Ад сацыяльнай сферы да развіцця вытворчай базы

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1–й стар. «МС».)*

Прадстаўнікам мясцовых органаў улады Наталля Качанава нагадала аб ключавых патрабаваннях Прэзідэнта: садзейнічанне занятасці, кантроль за цэнаўтварэннем і забеспячэнне росту заработнай платы. Яна дадала, што падрабязна азнаёмілася з планамі па развіцці горада, але хацела б пачуць меркаванні мясцовай улады, чаго не хапае для больш дынамічнага развіцця Бабруйска. «Вельмі важна тое, што адчуваеце і ведаеце вы. Людзі ў рэгіёнах вельмі тонка і выразна разумеюць, што трэба рабіць у сваім горадзе ці раёне, вобласці. Мы павінны звяраць гадзіннікі для таго, каб разумець, якія яшчэ законы, указы і пастановы патрэбныя, дзе яшчэ ёсць пытанні, якія неабходна ўрэгуляваць», — адзначыла кіраўнік Адміністрацыі.


Фота БелТА.

У Бабруйску Наталля Качанава азнаёмілася з добраўпарадкаваннем горада, наведала новыя мікрараёны, адну з трох «разумных» школ Магілёўскай вобласці, якая знаходзіцца тут, пабывала на «Бабруйскаграмашы» і «Чырвоным харчавіку».

Сярэдняя школа № 34 не выпадкова трапіла ў праграму візіта кіраўніка Адміністрацыі. Гэтую ўстанову яна наведвала яшчэ ў пачатку будаўніцтва. Адчынілі школу летась. Гэтым разам Наталля Качанава азнаёмілася з арганізацыяй навучальнага і выхаваўчага працэсаў, харчавання, работай спартыўных секцый і гурткоў.

«Вядома, гэта выдатны аб'ект. Самае галоўнае, што гэта запатрабаваная школа, у тым раёне, дзе яна патрэбна — дзе засяроджана вялікая колькасць людзей, — адзначыла Наталля Качанава падчас размовы з журналістамі. — Я яшчэ раз паглядзела на тыя пытанні, на якія акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы, па развіцці адукацыі: нагрузка на вучняў, харчаванне ў школах, выхаваўчы працэс, стаўленне да спорту. Хачу сказаць, што гэта цудоўная школа, тут добры калектыў».

Адно з галоўных прадпрыемстваў горада — «Бабруйскаграмаш». У холдынг уваходзяць шэсць заводаў з агульнай колькасцю занятых амаль 2,4 тысячы чалавек. Кіруючая кампанія холдынга налічвае каля 1,9 тысячы работнікаў. Сярэдні заробак тут звыш 820 рублёў.

Наталля Качанава азнаёмілася з прадукцыяй, што выпускаецца на прадпрыемстве, наведала некалькі цэхаў, дзе пагутарыла з кіраўніцтвам кампаніі і радавымі супрацоўнікамі. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, у прыватнасці, цікавілася перспектывамі развіцця прадпрыемства, планамі па пашырэнні вытворчасці і выпуску новай тэхнікі, асваеннем новых рынкаў. Як паведамілі Наталлі Качанавай, рэнтабельнасць продажаў на прадпрыемстве «Бабруйскаграмаш» у студзені — верасні склала 7 %, чысты прыбытак дасягнуў двух мільёнаў рублёў. Экспарт за гэтыя месяцы павялічыўся больш чым на 12 % у параўнанні з леташнім аналагічным перыядам.

Цяпер прадпрыемства актыўна асвойвае рынкі Афрыкі і Еўрапейскага саюза. Працпрацоўваюцца кантракты з Кеніяй, Замбіяй, Тога, Мадагаскарам, Літвой, Сербіяй, Швецыяй. Развіваецца супрацоўніцтва і з традыцыйнымі партнёрамі: Расіяй, Казахстанам, Узбекістанам.

«Адчуваецца, што тут ёсць гаспадарская рука, парадак. Самае галоўнае, што людзі працуюць, ёсць загружанасць. Тэхніка, якая выпускаецца, запатрабаваная сёння. Зніжэнне складскіх запасаў — гэта вельмі важна, таму што выпусціць можна, але важна яшчэ і рэалізаваць гэтую прадукцыю. Тут няма ніякіх праблем з рэалізацыяй», — адзначыла Наталля Качанава.

На яе думку, прадпрыемству таксама неабходна працаваць з навучэнцамі старэйшых класаў, дапамагаючы ім у выбары будучай прафесіі. Пабываўшы на вытворчасці, канстатавала Наталля Качанава, яны змогуць пазнаёміцца з асаблівасцямі розных рабочых прафесій і, магчыма, зрабіць выбар на іх карысць. «Калі пройдзеш і паглядзіш — такі графік работы, такая зарплата, інтэрнаты, гэта дапаможа дзецям сарыентавацца, і яны пойдуць у вучылішча», — лічыць кіраўнік Адміністрацыі.

У цэлым Наталля Качанава пазітыўна ацаніла цяперашні стан горада і яго прадпрыемстваў. «Я была тут раней, і ў мяне было сваё ўражанне пра гэты горад. Але тое, што я ўбачыла сёння, мяне парадавала», — рэзюмавала яна.

# ЭФЕКТЫЎНАЯ ПЛЯЦОЎКА

## Мінск у 2020 годзе плануе прыняць Форум па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў рэгіёне ЕАЭС

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі, Нацыянальны каардынатар па МУР Мар'яна Шчоткіна прыняла ўдзел у адкрыцці нацыянальных стратэгічных кансультацый ПРААН у Беларусі, паведамляе прэс-служба Савета Рэспублікі.**



sovrep.gov.by.

Мэта кансультацый — выпрацаваць ключавыя напрамкі сумеснай дзейнасці ПРААН і нацыянальных партнёраў з улікам прыярытэтаў развіцця Беларусі, каб уключыць іх у дакумент Краінавай праграмы ПРААН на 2021—2025 гады.

Мар'яна Шчоткіна нагадала, што ў Глабальным рэйтынгу «Індэкс устойлівага развіцця — 2019» з 162 дзяржаў свету Беларусь займае 23-е месца, што вышэй за ўзровень па рэгіёне. Такіх высокіх вынікаў удалося дабіцца агульнымі намаганнямі, падкрэсліла яна. «Мы зрабілі шмат: стварылі архітэктуру кіравання, арганізавалі работу каардынацыйнай рады і савета па ўстойлівым развіцці, уключылі ў працэс усіх зацікаўленых — парламентарыяў, выканаўчую уладу, рэгіянальныя і партнёрскія групы, — нагадала яна. — Важна не спыняцца на гэтым этапе. Ужо 26 верасня рэгіянальная група Магілёўскай вобласці збірае ўсіх зацікаўленых для падрыхтоўкі стратэгіі развіцця рэгіёна».

Зараз распрацоўваецца Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця да 2035 года. Гэта работа пабудавана такім чынам, каб улічваць прапановы рэгіёнаў, раёнаў краіны, сацыяльных груп, людзей. «Мы павінны разам актыўна абмяркоўваць, прапаноўваць і шукаць рацыянальныя стратэгіі, якія выведуць нашу краіну на новы высокі ўзровень развіцця», — дадала Мар'яна Шчоткіна.

Паводле яе слоў, устойлівае развіццё ўключае работу па таких ключавых кірунках, як эканамічнае развіццё, сацыяльная сфера, экалагічная бяспека, лічбавізацыя, маладзёжная палітыка, гендарная роўнасць і іншыя.

Гаворачы аб падрыхтоўцы новай Краінавай праграмы, Нацыянальны каардынатар падкрэсліла важнасць эфектыўнага планавання і расходавання сродкаў, забеспячэння выніковасці мерапрыемстваў. «На секцыях я прашу вас выказваць свае думкі, быць актыўнымі, прапаноўваць ідэі, якія дадуць добры вынік», — дадала Мар'яна Шчоткіна.

Яна таксама праінфармавала, што ў 2020 годзе Мінск плануе прыняць Форум па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў рэгіёне ЕАЭС. «Мы правялі Рэгіянальны форум нацыянальных каардынатараў па дасягненні МУР, Першы нацыянальны форум па ўстойлівым развіцці. І не спыняемся на дасягнутым: прапанавалі пляцоўку Мінска і свае паслугі, каб арганізаваць вялікі форум па МУР для рэгіёна ЕАЭС у першым паўгоддзі 2020 года, ужо атрымалі пацвярджэнне», — паведаміла Мар'яна Шчоткіна.

У інтэрв'ю журналістам яна адзначыла важнасць інфармавання насельніцтва аб рабоце па дасягненні МУР.

ВЫБАРЫ-2019

# ПАЧЭСНАЯ І АДКАЗНАЯ МІСІЯ

**Кіраўнік Штаба Місіі назіральнікаў ад СНД на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання Віктар Гумінскі 25 верасня наведаў Мінскую абласную выбарчую камісію, дзе азнаёміўся з яе работай.**

Місія назіральнікаў распачала сваю дзейнасць 4 верасня. Плануецца, што ў яе складзе будзе больш за 400 чалавек, у тым ліку каля 50 доўгатэрміновых назіральнікаў. На 25 верасня ўжо акрэдытавана 45. У склад Місіі ўвойдуць як прадстаўнікі непасрэдна ад краін — удзельніц СНД, так і ад Міжпарламенцкай асамблеі краін Садружнасці, Парламенцкага сходу Саюза Расіі і Беларусі, Выканаўчага камітэта СНД. Каардынуе работу назіральнікаў ад СНД Штаб місіі, які размясціўся ў будынку Выканаўчага камітэта СНД.

— На першым этапе нам удалося папрысутнічаць і паназіраць за працэсам фарміравання Мінскай гарадской і Мінскай абласной тэрытарыяльных выбарчых камісій, а таксама 37 акруговых выбарчых камісій у сталіцы і цэнтральным рэгіёне. Акрамя таго, кіраўнік Місіі назіральнікаў ад СНД Сяргей Лебедзеў сустрэўся з прадстаўнікамі Брэсцкай абласной выбарчай камісіі, — расказаў журналістам Віктар Гумінскі. — Таксама ў нас адбылася сустрэча са старшынёй Вярхоўнага Суда, дзе былі абмеркаваны пытанні ўзаемадзеяння, роля і функцыі гэтага органа па вырашэнні скаргаў, якія могуць узнікнуць падчас выбарчага працэсу.

Пасля фарміравання тэрытарыяльных абласных і Мінскай гарадской выбарчых камісій, акруговых камісій у Вярхоўны Суд паступіла 24 скаргі. «Усе яны задаволены ці адхілены ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам», — канстатаваў Віктар Гумінскі.

У найбліжэйшы час прадстаўнікі Місіі выедуць ва ўсе рэгіёны для назірання за фарміраваннем участковых выбарчых камісій, а таксама за працэсам рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. «Мы плануем цесна ўзаемадзейнічаць з місіямі іншых міжнародных арганізацый», — адзначыў кіраўнік Штаба.

Работа Місіі будзе будавацца на прынцыпах палітычнай нейтральнасці, неўмяшання ў выбарчы працэс, ва ўнутраныя справы дзяржавы, запэўніў Віктар Гумінскі: «Наша галоўная мэта — назіраць, і вывады мы будзем рабіць перш за ўсё на аснове асабістага назірання. А людзей у нас дастаткова. Вялікую зацікаўленасць праявілі рэгіёны Расійскай Федэрацыі, Казахстана і іншыя. Мы атрымалі ноту, што прадстаўнікі Малдовы не будуць удзельнічаць у рабоце місіі назіральнікаў ад СНД, таму што на гэты конт яны прынялі адпаведнае рашэнне. Па лініі Цэнтральнай выбарчай камісіі, наколькі мы валодаем інфармацыяй, Малдова будзе прымаць удзел. Украіне не накіроўвалі запрашэння, бо ў 2015 годзе яна выйшла з Пагаднення па ўдзеле ў назіранні за правядзеннем выбараў і рэферэндумаў у краінах СНД. Усе нашы прамежкавыя справаздачы і канчатковы дакумент будуць рыхтавацца зыходзячы з асабістага назірання, а таксама фактычных матэрыялаў, якія будуць прадстаўлены. Мы ўжо зрабілі запыты ў Генеральную пракуратуру Беларусі (з яе кіраўніцтвам запланавана сустрэча), у Вярхоўны суд, Міністэрства ўнутраных спраў і непасрэдна ў выбарчыя камісіі рознага ўзроўню».

Плануецца, што заключная прэс-канферэнцыя па асвятленні вынікаў работы Місіі пройдзе 18 лістапада.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# «ПУНКТЫ РОСТУ» РЭГІЁНАЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Для рэалізацыі пастаўленай задачы аблвыканкамамі зацверджаны Комплексныя планы паскоранага развіцця да 2020 года, якія ўключаюць мерапрыемствы па ўсіх кірунках і сферах дзейнасці. У дакументах вызначаны адказныя выканаўцы, тэрміны ажыццяўлення, крыніцы фінансавання, а таксама вынікі рэалізацыі мерапрыемстваў і плана ў цэлым.

Акрамя таго, у мэтах сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, забеспячэння занятасці насельніцтва, павышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі і актывізацыі інавацый штогод у абласцях, раёнах і гарадах абласнога падпарадкавання прымаюцца Планы развіцця. Яны дэталізуюць меры па рэалізацыі важнейшых кірункаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны.

Як паведамілі «МС» у Міністэрстве эканомікі Беларусі, паскоранае сацыяльна-эканамічнае развіццё 11 гарадоў забяспечваецца за кошт ажыццяўлення інвестыцыйных праектаў — «пунктаў росту» на буйных прадпрыемствах.

У Наваполацку вядзецца работа па трох аб'ектах (уваходзяць у комплекс запаволенага каксавання) на ААТ «Нафтан». На прадпрыемствах Полацкага раёна праходзіць мадэрнізацыя ў ААТ «Полацк-Шкловалакно», на Полацкім малочным камбінаце, філіяле «Полацкі хлебазавод» ААТ «Віцебскхлебпрам». Тэхнічнае «пераўзбраенне» адбываецца ў Аршанскім раёне на заводзе «Легмаш», станказаводзе «Чырвоны барацьбіт», ААТ «Оршаграпраммаш», Аршанскім ільнокамбінаце, у Мазырскім раёне — на ААТ «Беларускабель», у Салігорскім — на УП «Універсал-Літ», ЗАТ «Салігорскі інстытут праблем рэсурсазберажэння з вопытнай вытворчасцю».

Ажыццяўляецца будаўніцтва комплексу гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых рэшткаў на ААТ «Мазырскі НПЗ», працягваецца мадэрнізацыя сушыльнага аддзялення галоўнага корпуса па вытворчасці солі ў ААТ «Мазырсоль». У сельскай гаспадарцы Мазырскага раёна дзяржаўным прадпрыемствам «Саўгас-камбінат «Зара» працягваецца будаўніцтва і рэканструкцыя будынкаў цэха вытворчасці малака, цэха сухастою, радзільнага аддзялення, адрыны і склада пад ферму для вырошчвання бацькоўскага статка птушкі бройлера.

У Бабруйску ствараецца вытворчасць цэльнаметалакордных шын радыяльнай канструкцыі з пасадачным дыяметрам 25—29 цаляў у ААТ «Белшына».

Інвестпраекты рэалізуюцца на прадпрыемствах Барысаўскага раёна («СВУД экспарт», Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў, Барысаўскі завод «Аўтагідраўзмацняльнік», Барысаўскі завод агрэгатаў) і Салігорскага раёна («Беларуськалій», «Старобінскі ТБЗ»).

**Як адзначылі ў Міністэрстве эканомікі, правядзенне актыўнай інвестыцыйнай палітыкі з'яўляецца асноўным драйверам паскоранага развіцця эканомікі рэгіёнаў, але казаць аб якіх-небудзь высновах яшчэ рана. Вынікі рэалізацыі Комплексных планаў паскоранага развіцця рэгіёнаў будуць ацэньвацца па выніках бягучага года.**

У Аршанскім раёне распачата будаўніцтва чатырох малочнатаварных фермаў ад 1000 да 2000 галоў кожная, рэпрадуктара на 5000 галоў свінаматак, інавацыйнага комплексу для падрыхтоўкі насення сельскагаспадарчых культур у Рэспубліканскім вытворчым унітарным прадпрыемстве «Вусце» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Адзін з ключавых рэзерваў росту эканомікі на Аршаншчыне — развіццё транспартна-лагістычнай сістэмы за кошт будаўніцтва мультымадальнага прамыслова-лагістычнага комплексу ў пасёлку Балбасава. Асаблівасць комплексу ў тым, што ў ім будзе сфарміраваны інтэрмадальны кантэйнерны тэрмінал для апрацоўкі грузавых патокаў паміж краінамі Еўропы і Азіі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Інавацыйныя праекты і дарогі малой радзімы

**Зразумела, чым лепей і больш паспяхова працуе кожнае прадпрыемства і горад у цэлым, тым заможней і цікавей жывуць гараджане. Таму пры распрацоўцы комплекснага плана па паскораным сацыяльна-эканамічным развіцці Баранавіч на перыяд да 2020 года ўпор быў зроблены на прамысловасць, будаўніцтва, транспарт, дарожную і камунальную інфраструктуры. Адзін з пунктаў названага плана датычыўся Баранавіцкага вытворчага баваўнянага аб'яднання.**



Што і не дзіўна: гэтае прадпрыемства вядомае шырокаму колу спажыўцоў па назве «Блакіт», з даўніх савецкіх часоў значылася недзе ў першай тройцы самых значных у горадзе. Аднаму з горадаўтваральных прадпрыемстваў на рубяжы вякоў давялося перажыць у эканамічным плане складаны перыяд. Цяпер справы папраўляюцца. Найбуйнейшы вытворца тэкстыльнай прадукцыі ў Еўропе і краінах СНД мае поўны цыкл вытворчасці: ад перапрацоўкі бавоўны да выпуску гатовых швейных вырабаў. Росту попыту на прадукцыю «Блакіту» на айчынным і замежных рынках паспрыяла таксама паспяховая рэалізацыя інавацыйнага праекта па распрацоўцы і ўкараненні тэхналогіі лічбавага друку на баваўнянай тканіне для пасцельнай бялізны, прадугледжанага, дарэчы, комплексным планам.

> Летам зарэгістраваны фонд па добраўпарадкаванні вулічна-дарожных сетак «Баранавічы — наша малая радзіма». Усе ахвотныя могуць зрабіць свой унёсак у агульную справу.

Машыны набылі ў Італіі, для гэтага было выдзелена 700 тысяч еўра з інавацыйнага фонду аблвыканкама. А ў цэлым інвестыцыі ў праект склалі 1,7 мільёна рублёў. Новая тэхналогія дазваляе рабіць камплекты пасцельнай бялізны больш разнастайнымі, размяшчаць на іх розныя малюнкі. Такім чынам на дзіцячых камплектах з'явіліся казачныя і мульцяшныя героі, дарослая бялізна расквецілася самымі разнастайнымі ўзорамі.

Сёння баранавіцкія тэкстыльшчыкі пастаўляюць сваю прадукцыю ў Расію, Польшчу, Украіну, Венгрыю, Чарнагорыю, Казахстан, шэраг іншых краін.

— Для паляпшэння якасці прадукцыі і павышэння яе канкурэнтаздольнасці многія нашы прадпрыемствы ўзяліся за рэалізацыю інавацыйных праектаў, — кажа **першы намеснік старшыні Баранавіцкага гарвыканкама Наталля ФЁДАРАВА.** — Калі баваўнянае аб'яднанне завяршыла рэалізацыю свайго праекта летась, то ААТ «Таргмаш» пачало выпуск новай прадукцыі сёлета ў сакавіку. А прадукцыяй з'яўляюцца сучасныя машыны для прадпрыемстваў грамадскага харчавання з мадыфікацыямі, якія забяспечваюць укараненне высокапрадукцыйных тэхналогій. Баранавіцкі завод станкапрылад тым часам рэалізуе інавацыйны праект «Арганізацыя вытворчасці прэцызійных самацэнтруючых такарных патронаў розных дыяметраў для высокатэхналагічнага металаапрацоўчага абсталявання». Выпусціць першую партыю новай прадукцыі завадчане плануюць ужо да канца гэтага года.

Адразу два інавацыйныя праекты рэалізуе станкабудаўнічы завод, які з'яўляецца філіялам закрытага акцыянернага таварыства «Атлант». На заводзе асвойваецца выпуск высокаэфектыўных кампрэсараў серый СН і СНР для бытавых халадзільнікаў і маразільнікаў, а таксама ўкараняецца высокапрадукцыйны тэхналагічны працэс вытворчасці адлівак павышанай дакладнасці з высокатрывалага і шэрага чыгуну.



Фота БелТА.

У вытворчых цэхах завода аўтаматычных ліній неўзабаве пачнецца выраб спружынных клем для чыгуначных пуцей. Вытворчасць прадугледжана для патрэб Беларускай чыгункі.

Усе, хто апошнім часам ад'язджаў ці прыязджаў на вакзал Баранавічы-Палескія, думаю, заўважылі перамены, — працягвае Наталля Мікалаеўна. — Там вядуцца работы па добраўпарадкаванні прывакзальнай плошчы, працягваецца рэканструкцыя будынка вакзала. Усё гэта робіцца ў рамках рэалізацыі праекта, прадугледжанага планам комплекснага развіцця. Для паляпшэння транспартнага абслугоўвання жыхароў горада абнаўляецца парк аўтатранспарту, развіваецца і аптымізуецца сетка маршрутаў экспрэсных зносін.

У галіне будаўніцтва галоўным застаецца ўвод у эксплуатацыю запланаваных аб'ёмаў жылля. Вядзецца забудова жылых раёнаў Паўночны-2, Анісімавічы-1, Дуброва-4, дзе ўзводзяцца сучасныя добраўпарадкаваныя кватэры. Асаблівая ўвага надаецца паляпшэнню камунальнай інфраструктуры горада. Рэканструкцыя пуцеправода па вуліцы Леніна і ўладкаванне праезду ад вуліцы Усходні праезд да вуліцы Чурыліна палепшаць якасць жыцця многіх гараджан — як і ў цэлым добраўпарадкаванне вуліц, дарог, тэрыторый, якое актыўна вядзецца ў горадзе. У агульнай справе бяруць удзел прадпрыемствы, арганізацыі, прадстаўнікі бізнесу і гараджане. Летам зарэгістраваны фонд па добраўпарадкаванні вулічна-дарожных сетак «Баранавічы — наша малая радзіма». Усе ахвотныя могуць зрабіць свой унёсак у агульную справу.

Комплексны план ахоплівае таксама гандаль і грамадскае харчаванне. У адпаведнасці з ім да канца наступнага года прадугледжана ўвесці ў эксплуатацыю 11 новых аб'ектаў. «Цяпер уведзена дзевяць, — паведаміла **начальнік упраўлення эканомікі гарвыканкама Эла СТАШЭНКА.** — Таксама вялікая работа праводзіцца па прыцягненні ў гаспадарчы абарот аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца або выкарыстоўваюцца неэфектыўна. Цяпер на 21 з 23 індустрыяльных пляцовак, якія сфарміраваны на базе такіх аб'ектаў, прыйшлі новыя ўласнікі. На іх ажыццяўляюць дзейнасць 13 арганізацый, работу атрымалі каля 60 чалавек».

Рэалізуецца шэраг праектаў у галінах аховы здароўя, адукацыі, сферы фізкультуры і спорту. Для медыцынскай галіны 179-тысячнага горада найважнейшым цяпер з'яўляецца будаўніцтва станцыі хуткай медыцынскай дапамогі, якую плануецца здаць налета.

А ў галіне адукацыі галоўным праектам, рэалізацыі якога чакалі жыхары мікрараёна Бараўкі, аказаўся дзіцячы садок на 240 месцаў. Яго ўрачыста адкрылі на пазамінулым тыдні. На будаўніцтва дашкольнай установы з бюджэту было выдзелена восем мільёнаў рублёў.

У новым садку ўжо сфарміравана 13 груп. Там усё прадугледжана для камфорту дзяцей і зручнасці бацькоў. На першым паверсе будуць займацца малыя ад двух да трох гадоў. Там жа размешчаны басейн, харчовы блок, зімовы сад. На другім і трэцім паверсе знаходзяцца групы для старэйшых дзяцей, кабінеты дадатковага навучання, музычная і спартыўная залы, камп'ютарны клас. Дарэчы, з наступнага года плануецца пачаць будаўніцтва школы ў Браўках на 1020 месцаў. Для маладога раёна, які да таго ж актыўна развіваецца, гэта вельмі патрэбны аб'ект.

«Рэалізацыя мерапрыемстваў комплекснага плана забяспечыць павышэнне эканамічнага патэнцыялу горада, развіццё асноўных галін — прамысловасці, транспарту, малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, маёмаснага комплексу, а таксама інстытуцыянальнага асяродку і сацыяльнай сферы. Усё гэта паспрыяе росту дабрабыту гараджан і паляпшэнню якасці іх жыцця», — адзначыла Наталля Фёдарава.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Тэлесеткі

# У ЭФІРЫ НОВЫ БРЭНД

**Канал «Мінск TV», які мае гісторыю даўжынёй у сем гадоў, пераходзіць на кругласутачнае вяшчанне і пераўтвараецца ў «ЯСНАе TV». Новы брэнд запусціла кампанія «Белтэлекам», якая ўжо прэзентавала вонкавае афармленне, а неўзабаве абяцае прадставіць гледачам і новую канцэпцыю канала.**

«ЯСНАе TV» мае рускую і беларускую мову вяшчання, арыентавана на шырокую аўдыторыю: глядач любога ўзросту, полу і прафесіі знойдзе для сябе штосьці цікавае, — гаворыць тэлевізійнікі. — У нас знойдзецца месца «залатому фонду» мастацкага кіно і рэйтынгавым стужкам апошніх гадоў, айчынным і замежным серыялам, мультыплікацыі і дакументальным фільмам, спартыўным спаборніцтвам. Спадзяёмся, што ўнясём яснасці ў паўсядзённае жыццё і зробім яго ярчэйшым і цікавейшым». Напрыклад, ужо вядома, што ў прамым эфіры ў фармаце Full HD тэлеканал пакажа ўсе гульні чэмпіянату Беларусі па футболе, не забудзецца таксама пра хакей і нават кіберспорт.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ВАШЫ ЗВОНКІЯ, МУЖЧЫНЫ, ГАЛАСЫ




**Вы марылі стаць тэлевядучым, але ўсё неяк не складвалася? Магчыма, зоркі сыдуцца гэтым разам: канал АНТ абвясціў кастынг новых вядучых — мужчын, ва ўзросце ад 30 гадоў і старэйшых, з выдатным валоданнем беларускай і рускай мовамі.**

Сярод іншых умоў адбору — вышэйшая адукацыя, фотагенічнасць, прыемны голас і добрая дыкцыя. А вось вопыт работы ў эфіры не абавязковы, хоць, безумоўна, лішнім не будзе.

Запоўніць заяўку на кастынг можна да 10 кастрычніка на сайце www.ont.by у раздзеле «Праграмы і праекты — Кастынг». Да анкеты, якая, дарэчы, уключае спасылкі на вашы старонкі ў сацсетках, неабходна далучыць 20-секунднае відэа-самапрэзентацыю, знятую гарызантальна на мабільны тэлефон, а таксама два фота: партрэт і агульны план. Хто ведае — можа, новыя тэлепраекты чакаюць менавіта вас?

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# ШАШКІ

**(«Звязда»)**

Выпуск № 97

У пачатку верасня чэмпіянат свету сярод мужчын і жанчын па шашках-64 адбыўся ў балгарскім горадзе Святы Улас. Беларускія спартсмены заваявалі амаль усе медалі. Яна Якубовіч і Ігар Міхальчанка сталі двойчы чэмпіёнамі свету. Яна перамагла ў класічнай праграме і бліцы, Ігар стаў найлмацнейшым у класічнай і хуткай праграмах. Чэмпіёнкай свету ў хуткай праграме стала Дар'я Федаровіч. Па выніках чэмпіянату Уладзіслаў Валюк, які выйграў сярэбраны медаль, і Яна Якубовіч выканалі званне міжнародных гросмайстраў. Паглядзіце прыклады гульні ўдзельнікаў.

№ 60



№ 60 Я. Кандрачэнка — Д. Цынман, хуткая праграма, бразільскія шашкі.

**Белыя простыя шашкі:** a1, b2, h2, a3, e3, g3, d4, c5, e5 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** a5, b6, f6, h6, a7, b8, d8, f8, h8 (9).

11...dc7? (Чорныя ўпускаюць выйгрыш, для перамогі трэба было гуляць наступным чынам: 11. ...de7! 12. eg7 hf6 13. bc3 ab4! 14. cc7 bb4 15. ac5 ed6 X).

Для самастойнага рашэння прапануем кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела.

№ 61

**Белыя простыя шашкі:** e3,c5,b6, дамкі: a7 (4).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, g3, f4, e5, g5, e7, g7, b8 (8).

№ 62

**Белыя простыя шашкі:** d2, a3, c3, e3, a5, d6 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** f4, g5, a7, дамкі: g1, (4).

№ 63

**Белыя простыя шашкі:** a1, a3, f4, c5, b6 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** d2, f6, h6, a7 (4).

№ 64

**Белыя простыя шашкі:** 27, 30, 31, 32, 39, 43, 44 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** 7, 17, 18, 25, 34, 38, 41 (7).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Удакладненне: конкурснае заданне № 10

**Белыя простыя шашкі:** h2, d4, f4, дамкі: h6 (4).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, c3, b6 (3).

Праверце свае рашэнні: выпуск № 96 ад 13.09.19.

№ 58 1.18-13 37x17 2. 31x02 09x18

[2. ...08x19 3. 02x16 36-41 4. 50-45 41-46 5.16-32 46x40 6. 45x34 ]

3.02x16 36-41 4. 50-45 41-47 5.16-38 47x40 6. 45x34+

№ 59 1. 47-41 36x38 2. 31x33 39x17 3. 50x08 03x12 4. 27-22 17x28 5. 20-14 19 09x20 6. 15x22 12-18 7. 22x13

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Бурко (Орша), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Статкевіч (пасёлак Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцвінаў (усе — Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013. E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# «Вусы, лапы і хвост — вось нашы дакументы!»



Першая сустрэча гледачоў з героямі маляванага сямейнага мультфільма, які быў створаны паводле аповесці Эдуарда Успенскага «Дзядзька Фёдар, сабака і кот», адбылася яшчэ ў 1978 годзе. Потым гісторыя «Трое з Прастаквашына» мела працяг — «Канікулы ў Прастаквашыне» і «Зіма ў Прастаквашыне». І што б вы думалі, за 40 гадоў мультфільм не толькі не страціў сваіх пазіцый — паводле сацыялагічных даследаванняў, у Расіі трылогія аб Прастаквашыне ўваходзіць у топ-3 любімых мультфільмаў, — але і атрымаў другое жыццё. Летась знакамітая студыя «Саюзмультфільм» запусціла мультсерыял «Новае Прастаквашына», і да 2020 года павінны выйсці 30 серый аб прыгодах гарадскога хлопчыка дзядзькі Фёдара, сабакі Шарыка, ката Матроскіна, паштальёна Печкіна і іншых герояў у вёсцы.

Нагадаем, гісторыя ў савецкім мультфільме пачалася з таго, што вельмі самастойны хлопчык, якому бацькі забаранялі трымаць дома жывёл, перабраўся ў вёску і пасяліўся ў закінутым доме з новымі сябрамі — катом Матроскіным і сабакам Шарыкам. Мясцовы паштальён Печкін, усюдыісны і пранырлівы чалавек, паведаміў бацькам пра месцазнаходжанне хлопчыка, каб атрымаць абяцаную ўзнагароду — ровар. Але бацькі не толькі не пакаралі сына і не забралі яго дадому, але і самі паступова ацанілі хараство вясковага жыцця...

Што цікава, рэжысёр трылогіі Уладзімір Папоў падзяліў работу над экраннымі персанажамі паміж двума мастакамі: Лявону Хачатрану мы мусім быць удзячнымі за паштальёна Печкіна, самога дзядзьку Фёдара і яго тату і маму (апошнюю мастак «спісаў» са сваёй жонкі актрысы Ларысы Мясніковай), Мікалай Ерыкалаў адказваў за жывёльны свет: Шарыка, Матроскіна, галчаня Хапайку, карову Мурку і цяля Гаўрушу. Персанажы ад серыі да серыі крыху змяняюцца — асабліва гэта бачна па дзядзьку Фёдару.

**Мазыр — адзін з самых буйных прамысловых цэнтраў вобласці. Тут дзейнічаюць прадпрыемствы, якія прадстаўляюць практычна ўсе галіны народнай гаспадаркі: нафтаперапрацоўку, вытворчасць малочных і мясных прадуктаў, солі, машын і абсталявання, кабеляў, швейных вырабаў... Увогуле, Мазыршчына аказвае значны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё як Гомельскай вобласці, так і краіны ў цэлым. Цяпер перад гэтым райцэнтрам пастаўлена задача знайсці тыя пункты росту, якія дазволяць вывесці яго эканоміку на новы ўзровень.**



Дарэчы, узровень жыцця тут і сёння высокі. За студзень — жнівень гэтага года аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі ў фактычных цэнах склаў 6,8 мільярда рублёў, ці 111,2 %. Сярэдні заробак па раёне зараз — 909 рублёў. І ўсё ж магчымасці для далейшага дынамічнага развіцця ёсць.

Цяпер у Мазырскім раёне распрацаваны і паспяхова рэалізуецца план комплекснага сацыяльна-эканамічнага развіцця да 2020 года. Перспектыўныя задачы — павялічыць эфектыўнасць эканомікі раёна, сфарміраваць доўгатэрміновую аснову яе ўстойлівага росту, палепшыць дабрабыт грамадзян і стварыць камфортныя і бяспечныя ўмовы для іх жыцця. У комплексным плане адлюстраваны і праблемы, якія неабходна вырашыць на асобных прадпрыемствах. Таксама прадугледжана добраўпарадкаванне тэрыторый, будаўніцтва новых аб'ектаў, што пацягне стварэнне новых рабочых месцаў.

**Мазырскі раён — адзін з самых буйных у Гомельскай вобласці. Не толькі па плошчы (яна складае 160 тысяч гектараў), але і па наяўнасці горадаўтваральных прадпрыемстваў, якія вызначаюць узровень развіцця рэгіёна ўвогуле і дабрабыту кожнага са 134 тысяч яго жыхароў у прыватнасці.**

Многія прадпрыемствы Мазыра вядомыя не толькі на Гомельшчыне, але і ва ўсёй краіне. Завяршэнню інвестыцыйных праектаў, якія ўжо распачаты, павышэнню эфектыўнасці работы, забеспячэнню загрузкі вытворчых магутнасцяў і нарошчванню аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі цяпер аддаецца асаблівая ўвага, адзначае **старшыня Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА:**

— Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод працягвае рэалізацыю праекта па будаўніцтве комплексу гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых рэшткаў. «Мазырсоль» праводзіць мадэрнізацыю, машынабудаўнічы завод плануе абнаўленне парку абсталявання, працягваюць тэхналагічнае пераўзбраенне «Беларускабель» і Мазырская швейная фабрыка «Надэкс»... Адначасова важныя праекты рэалізуюцца ў аграпрамысловым комплексе раёна, у сацыяльнай сферы і іншых галінах.

Інвестараў на Мазыршчыну прыцягвае выгаднае геаграфічнае становішча і развітая транспартная інфраструктура. З аўкцыёнаў прадаюцца аб'екты, якія не выкарыстоўваліся ў гаспадарчым абароце. Сёння ўлады Мазыра стварылі максімальна камфортныя ўмовы для бізнесу. На 1 верасня ў раёне працавалі 3493 суб'екты гаспадарання, у тым ліку 2707 індывідуальных прадпрымальнікаў, 786 малых і сярэдніх арганізацый. Дарэчы, доля паступленняў падаткаў плацяжоў у кансалідаваны бюджэт ад малога і сярэдняга бізнесу складае каля 7,4 %.

Рашэнне актуальных пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця, павышэнне дабрабыту насельніцтва ў многім залежыць і ад дэпутацкага корпуса. Сёння мясцовае самакіраванне Мазырскага раёна прадстаўлена раённым Саветам дэпутатаў і дзесяццю сельскімі. Шмат залежыць ад ініцыятыўнасці і адказнага стаўлення да справы як дэпутатаў усіх узроўняў, так і ўпаўнаважаных сельскіх населеных пунктаў і грамадзян у камітэтах тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Гэта яны першымі аператыўна рэагуюць і задавальняюць патрэбы людзей, ад іх часцяком залежыць канструктыўнае ўзаемадзеянне з мясцовымі органамі ўлады, падкрэслівае **старшыня Мазырскага раённага Савета дэпутатаў Валянціна НАЗАРАНКА:**

— Для мабілізацыі чалавечага патэнцыялу, фінансавых і матэрыяльных сродкаў і магчымасцяў па рашэнні пэўных пытанняў развіцця тэрыторый выкарыстоўваюцца розныя формы і метады. У нас створаны і працуюць «грамадскія прыёмныя», куды людзі могуць звярнуцца па тэлефоне, электроннай пошце ці асабіста. Асаблівая ўвага аддаецца прыёму грамадзян і кантролю за выкананнем іх запытаў. Усе дэпутаты раённага Савета дэпутатаў вядуць прыём згодна з графікам. У прыватнасці, за 2019 год праведзены 351 прыём. 229 грамадзянам дадзены тлумачэнні ці аказана садзейнічанне ў рашэнні іх пытанняў.

Дарэчы, сустрэчы па месцы жыхарства даўно сталі традыцыяй. Яны дазваляюць найбольш поўна вывучаць хвалюючыя пытанні на вёсцы. Сёлета такія сустрэчы адбыліся ў вёсках Барбароўскага, Крынічнага, Козенскага сельскіх Саветаў. У жніўні прайшло выязное пасяджэнне прэзідыума райсавета і райвыканкама з наведваннем мікрараёна Чыгуначны. Размова ішла пра сумесную дзейнасць мясцовага камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, жыллёва-эксплуатацыйнага ўчастка № 8 Мазырскага райжылкамгаса, грамадскіх арганізацый па пытаннях добраўпарадкавання і навядзення парадку на зямлі.

— У сістэму работы ўвайшло і штоквартальнае правядзенне сходаў грамадзян у сельскіх населеных пунктах, — адзначае Валянціна Аляксееўна. — Праблемы, закранутыя на сходах, ставяцца на кантроль мясцовай уладай і накіроўваюцца ў адпаведныя раённыя службы для разгляду. Актуальна і карысна ва ўсіх адносінах правядзенне практычных семінараў — Дзён сельсаветаў. Сёлета яны прайшлі ў пяці: Прудкоўскім, Крынічным, Махнавіцкім, Скрыгалаўскім, Козенскім. Такім мерапрыемствам абавязкова папярэднічае добраўпарадкаванне тэрыторыі населеных пунктаў. Інфармаваннем насельніцтва аб дзейнасці дзяржаўных органаў і тлумачэннем дзяржаўнай палітыкі займаюцца інфармацыйна-прапагандысцкія групы. Таксама пры Мазырскім раённым Савеце дэпутатаў створаны Маладзёжны парламент. Узрост яго ўдзельнікаў — ад 13 да 19 гадоў. Гэты орган самакіравання дазваляе падлеткам расказваць пра свае праблемы так, каб іх чулі дарослыя, якія прымаюць рашэнні.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара.**

ЭКАНОМІКА

# ЯК ЗАСТАЦЦА НА РЫНКУ?

## Выязная сесія Брэсцкага абласнога савета разгледзела работу прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці

**Гаворку пра мясцовую прамысловасць на Брэстчыне часцей за ўсё пачынаюць з Даманаўскага вытворча-гандлёвага камбіната. Гэта прадпрыемства з унікальнай вытворчасцю, яно адзінае ў Беларусі, падобных заводаў усяго некалькі нават на ўсю вялікую Расію. У Даманаве выпускаюць вадкае шкло, будаўнічыя сумесі, інгрэдыенты для пральных парашкоў, іншую прадукцыю. Не дзіўна, што дэпутаты абласнога Савета абмеркаванне стану спраў на прадпрыемствах Дзяржаўнага прадпрыемства «Брэстмясцпрам» пачалі з наведвання гэтага камбіната.**

Даманаўскі ВГК цікавы яшчэ і тым, што знаходзіцца ў вёсцы Іваоцэвіцкага раёна з насельніцтвам каля тысячы чалавек. Камбінат сёння дае работу амаль 170 працаўнікам, абсалютная большасць якіх сельскія жыхары.

> Кіраўніку і спецыялістам удалося на былой вытворчай базе пабудаваць новую вытворчасць, захаваць калектыў ва ўмовах, калі цяжкім грузам вісяць даўгі былых гадоў. І ўсё таму, што на прадпрыемстве кампетэнтна пралічвалі кожны фінансавы крок, уважліва вывучалі рынкі збыту.

Яго гісторыя пачынаецца ў далёкім 1944 годзе, але ж новае дыханне і новы змест прадпрыемства атрымала ўжо ў XXI стагоддзі. Апошняе дзесяцігоддзе тут вялася паэтапная мадэрнізацыя вытворчасці, накіраваная перш за ўсё на эканомію паліўна-энергетычных рэсурсаў. Сапраўдным прарывам стала рэалізацыя праекта па рэканструкцыі шкловарнай печы № 1. У выніку дасягнута зніжэнне спажывання прыроднага газу на 20 працэнтаў, а вытворчая магутнасць печы павялічылася на 31 працэнт. Гэта было ў 2010 годзе. А роўна праз год камбінат асвоіў выпуск інавацыйнага віду прадукцыі — сілікату натрыю гідратаванага. Цяпер увесь аб'ём гэтай прадукцыі пастаўляецца на экспарт.

У 2012 годзе камбінат мадэрнізаваў шкловарную печ № 2. Гэтым разам спажыванне газу паменшылася на 15 працэнтаў, а вытворчая магутнасць печы ўзрасла на 40 працэнтаў. Апошнім часам спецыялісты Даманаўскага ВГК актыўна працуюць над падрыхтоўкай праекта па вытворчасці безводнага метасілікату натрыю. Дасягнутая дамоўленасць аб апрабацыі новай прадукцыі ў адной з лабараторый Германіі. Выпрабаванні павінны прайсці ўжо ў наступным месяцы. А сертыфікат лабараторыі ў выпадку яго атрымання адкрые дарогу на многія рынкі замежжа.

**Дырэктар камбіната Святлана МАСЮК,** якая, дарэчы, два мінулыя скліканні была дэпутатам абласнога Савета, паведаміла, што новую вытворчасць яны змаглі арганізаваць у старых сценах.

Варта сказаць, што хапае цяжкасцяў і на гэтым прадпрыемстве. Укладанні ў мадэрнізацыю запатрабавалі эканоміі, скарачэння іншых выдаткаў. Але ж зараз прадпрыемства працуе стабільна. На некаторых вытворчасцях работа арганізавана ў тры змены, бо печ па тэхналогіі нельга спыніць альбо выключыць. Сярэдняя зарплата работнікаў камбіната крыху вышэйшая, чым у працаўнікоў, напрыклад, аграрнага сектара раёна.



Названае прадпрыемства не раз падчас абмеркавання на пасяджэнні сесіі называлася флагманам мясцовай прамысловасці Брэстчыны. А ўсяго абласное ўпраўленне мясцовай прамысловасці мае пад сваім крылом пяць прадпрыемстваў самых розных кірункаў. Напрыклад, Антопальская ватна-прадзільная фабрыка выпускае матрацы і коўдры, Бярозаўскі завод «Цеплапрыбор» спецыялізуецца на катлах і падобных канструкцыях, брэсцкае галаўное прадпрыемства займаецца швейнай і іншай прадукцыяй, дае работу інвалідам, многія з якіх працуюць надомна.

**Дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Брэстмясцпрам» Леанід ШЛЫКАЎ** расказаў пра эканамічнае становішча кожнага з прадпрыемстваў, прывёў лічбы і факты, якія адлюстроўваюць стан спраў за апошнія гады. Паводле паказчыкаў, прасочваецца станоўчая дынаміка развіцця большасці прадпрыемстваў. За апошнія тры гады адзначаны рост аб'ёмаў вытворчасці, многія займаюцца інавацыйнай прадукцыяй. На ўсіх прадпрыемствах упраўлення занята амаль 480 чалавек.

Але ж, думаю, варта згадаць, што такое наогул мясцовая прамысловасць. Гэта прадпрыемствы, якія арганізоўваліся ў асноўным пасля вайны, калі трэба было адраджаць народную гаспадарку і даваць людзям работу. Тады фактычна ў кожным раёне, дзе была гліна, адкрываліся цагельныя заводы. Яны функцыянавалі з аднолькавай прымітыўнай тэхналогіяй, на іх выкарыстоўвалася цяжкая ручная праца. З механізацыі найчасцей значылася стужка транспарцёра, з якой трэба было хапаць рукамі пяць-шэсць вільготных цаглін і складваць адмысловымі радамі (паспрабуйце падняць і ўтрымаць у адзін рад пяць сухіх цаглін! — **Аўт.**) І вось такія заводы датрывалі да 90-х, а то і да рубяжу вякоў, а потым яны непазбежна закрываліся. Не лепшыя па сваёй якасці былі тэхналогіі на іншых вытворчасцях, таму іх проста выціснуў з рынку час з яго новымі патрабаваннямі. І на Брэстчыне, як у іншых рэгіёнах, такія прадпрыемствы адно за адным закрываліся. Напрыклад, у Дзівіне Кобрынскага раёна паспяхова працуе замежнае прадпрыемства «Лангхайнрых» па вытворчасці сталовай і пасцельнай бялізны. І ўсё таму, што тагачаснае кіраўніцтва «Мясцпрама» знайшло інвестара і выгадна рэалізавала вытворчыя плошчы. Вось і летась ліквідаваны Пружанскі камбінат будаўнічых матэрыялаў, а маёмасць «Кобрынскага хіміка» прададзена КУП «Брэстжылбуд» з захаваннем вытворчасці і працоўнага калектыву.



Новае абсталяванне на заводзе «Цеплапрыбор».

А хто хоча застацца на рынку, у таго няма іншага выйсця, як перастройваць сваю работу на новы лад, выпускаць канкурэнтаздольную прадукцыю, адным словам, станавіцца сучасным вытворцам. Паказальным у гэтым сэнсе можа быць прыклад ААТ «Цеплапрыбор», якое знаходзіцца ў Бярозе. Яшчэ ў сакавіку 2016 года Эканамічны суд Брэсцкай вобласці прыняў рашэнне аб банкруцтве названага завода і ўвёў працэдуру санацыі. Тэрмін яе завяршэння летась прадоўжаны да верасня 2023 года. Як заўважыў Леанід Шлыкаў, ход санацыі можна лічыць паспяховым: пагашана значная частка даўгоў, працягваецца работа па аднаўленні плацежаздольнасці прадпрыемства.

На сесіі адзначалася, што завод у многім абавязаны антыкрызіснаму кіраўніку Мікалаю Мурашкіну, які здолеў накіраваць калектыў на выкананне першачарговых задач. Сёння «Цеплапрыбор» асвоіў выпуск катлоў для ацяплення індывідуальных жылых дамоў пелетамі. Выпушчана першая партыя прыбораў і адпраўлена на выпрабаванне.

Ажыццяўляецца сумесны праект з польскімі партнёрамі па выпуску металічных каркасаў для мэблі. У стадыі прапрацоўкі новыя праекты і новыя задумкі. Як адзначыў **старшыня абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ,** «Цеплапрыбор» — гэта прыклад таго, як прадпрыемства з маральна састарэлым абсталяваннем і такімі ж тэхналогіямі паступова перастройваецца на новыя рэйкі. Кіраўніку і спецыялістам удалося на былой вытворчай базе пабудаваць новую вытворчасць, захаваць калектыў ва ўмовах, калі цяжкім грузам вісяць даўгі былых гадоў. І ўсё таму, што на прадпрыемстве кампетэнтна пралічвалі кожны фінансавы крок, уважліва вывучалі рынкі збыту.

Чаго, на жаль, не скажаш, пра Антопальскую ватна-прадзільную фабрыку, дзе нядаўна дапусцілі пралік. На прадпрыемстве занятыя 89 чалавек. Фабрыка выпускае матрацы, коўдры, падушкі, пакрывалы, ручнікі, іншую прадукцыю. А не так даўно асвоілі выпуск вільготных сурвэтак для апрацоўкі вымя кароў. Абсталяванне купілі за сродкі інавацыйнага фонду аблвыканкама, а кошт прадукцыі і яе канкурэнтаздольнасць на рынку загадзя не вызначылі. І выйшла, што антопальскія сурвэткі значна даражэйшыя за прадукцыю іншых пастаўшчыкоў. Дэпутаты-аграрыі, якія прысутнічалі на сесіі, казалі, што цяпер кожны грошы лічыць, таму яны купляюць прадукцыю ў таго, хто прадае танней. А ў Антопалі новая лінія загружана ўсяго на 12 працэнтаў. Таму аблвыканкам можа запатрабаваць вярнуць сродкі, якія неэфектыўна выкарыстаныя. Антопальцам цяпер варта актыўна шукаць рынкі збыту, прымаць маркетынгавыя захады. Бо сучасны рынак — рэч жорсткая, любыя, нават невялікія хібы ён не даруе. Трэба ўлічваць гэта ўсім, хто хоча застацца ў асяродку гэтага рынку.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Івацэвіцкі раён.*

МАТАЙ НА ВУС

# СЛАЎГАРАД МАДЭЛЮЕ БУДУЧАЕ

**Не так даўно на Блакітнай крыніцы, што ў Слаўгарадскім раёне, зноў было шматлюдна. Тут прайшоў першы гастранамічны фестываль з прэзентацыямі страў, канцэртамі мастацкай самадзейнасці, выстаўкамі-дэгустацыямі. Але мэта яго была не проста людзей пацешыць. Такім чынам раён рэалізуе трохгадовы план мясцовага эканамічнага развіцця, які быў летась распрацаваны пры падтрымцы ініцыятывы Еўрапейскай камісіі «Мэры за эканамічны рост». Слоган гэтага плана «Слаўгарадскі раён — тэрыторыя паспяховай рэалізацыі прадпрымальніцкіх ідэй».**

— У мэтах рэалізацыі плана распрацаваны праект «МОСТ як пілотная эка-бізнес-мадэль для мясцовага і рэгіянальнага эканамічнага росту», дзе прапісаны падзейныя мерапрыемствы, якія мы павінны правесці, — тлумачыць **старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Наша мэта — прыцягнуць да сябе як мага больш увагі і адпаведна турыстаў, партнёраў, ініцыятыўных людзей. За некалькі кіламетраў ад крыніцы мы пачалі рамонт пустуючых будынкаў для адкрыцця там рэгіянальнага цэнтра развіцця сельскіх тэрыторый. Будзем аказваць садзейнічанне прадстаўнікам малога і сярэдняга бізнесу, займацца прасоўваннем мясцовай прадукцыі і паслуг, умацоўваць узаемадзеянне з прылеглымі раёнамі, каб разам вырашаць пытанні занятасці і самазанятасці насельніцтва. І фестывалі — гэта адзін з інструментаў дасягнення мэты. Да канца года плануем правесці яшчэ два — велафестываль і эка-фота-пленэр. Кірункі, як бачыце, вельмі розныя, ад кулінарнага да спартыўнага і нават мастацкага. У будучым мы бачым, што наш Слаўгарадскі раён стане тэрыторыяй адкрытай і канкурэнтаздольнай, з эканомікай, якая стабільна развіваецца і рэалізуе свой інавацыйна арыентаваны прадпрымальніцкі патэнцыял на аснове дзяржаўна-прыватнага партнёрства і рэгіянальнага супрацоўніцтва ў сферах сельскай гаспадаркі, экалагічнага, паломніцкага і кулінарнага турызму. Мы бачым наш раён месцам для годнай перспектыўнай работы і прывабным для наведвання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# ЖЫЦЦЁ БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ

## У Гродне пачаў дзейнічаць першы спартыўны інклюзіўны цэнтр

**Падчас яго адкрыцця было заяўлена, што ў абласным цэнтры звяртаюць увагу на безбар'ернае асяроддзе. Вядзецца работа па абсталяванні пандусаў і пад'ёмнікаў. Большая частка грамадскага транспарту мае нізкія прыступкі, працуюць сацыяльныя таксі. Але ў горадзе тым не менш ёсць недахоп у памяшканнях для сумеснага правядзення вольнага часу.**



Увядзенне новага цэнтра значна зніме гэту праблему, а таксама дазволіць больш увагі аддаваць здароваму спосабу жыцця. Па словах **каардынатара праекта Ігара ДУБОВІКА**, тут змогуць трэніравацца людзі з рознымі фізічнымі магчымасцямі, у тым ліку з інваліднасцю. А гэта менавіта тая катэгорыя, якая мае патрэбу ў сістэмным аздараўленні.

Але не толькі. Як адзначыў **старшыня Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў Барыс ФЁДАРАЎ**, новы цэнтр стане месцам сяброўскіх сустрэч і адаптацыі людзей з інваліднасцю.

— Калі паглядзець, можна ўбачыць, як рухаецца і развіваецца гэты кірунак. Такі падыход заканамерны, бо кожны чалавек павінен забяспечвацца высокай якасцю жыцця і адчуваць сябе камфортна ў грамадстве, — адзначыў Барыс Фёдараў. — Таму новы цэнтр — не проста аб'ект з безбар'ерным асяроддзем. Гэта яшчэ і памяшканне, дзе людзі з абмежаванымі магчымасцямі могуць знаёміцца, займацца сваёй фізічнай формай, будаваць адносіны. І з'яўленне такіх аб'ектаў — свайго роду індыкатар стаўлення грамадства да праблем людзей з інваліднасцю.




Інклюзіўны цэнтр знаходзіцца ў будынку побач са спартыўным комплексам «Нёман». І тут усё зроблена так, каб інваліды-калясачнікі адчувалі сябе камфортна і пры гэтым маглі займацца спортам. Для гэтага тут устаноўлены адпаведныя трэнажоры, сталы для настольнага тэнісу і іншых настольных гульняў, баксёрскія прылады, кушэтка для рэабілітацыі апорна-рухальнай сістэмы і іншае.

— Інваліды-калясачнікі, якія ў адзін момант згубілі магчымасць актыўнага руху, да спорту ставяцца нават больш прыязна, чым тыя, у каго няма такіх праблем са здароўем, — кажа **намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Зоя КУЛЕША.** — І пакуль многія шукаюць адгаворкі і апраўданні свайму пасіўнаму спосабу жыцця, людзі з абмежаванымі магчымасцямі асвойваюць новыя спартыўныя вяршыні, няхай нават з рызыкай для сябе. Многія нашы інклюзіўныя спартсмены дабіліся выдатных вынікаў на многіх спартыўных спаборніцтвах, у тым ліку Параалімпійскіх гульнях.

Пасля ўрачыстага адкрыцця ўсе прысутныя змаглі азнаёміцца з магчымасцямі новага абсталявання. Інструктар па інклюзіўным кросфіце Віктар Захар'еў правёў інфармацыйны варкшоп. (Дарэчы, кросфіт — гэта праграма інтэнсіўных практыкаванняў на моц і трываласць, якія чаргуюцца.)

— У гэтай спартыўнай зале калясачнік, калі ён хоць бы крыху мабільны, можа залезці і пракачаць сабе грудную клетку і спіну, пацягаць блок. Яшчэ можна са штангай пазаймацца, — паведаміў інструктар. — Любы занятак спортам — гэта вялікая карысць для арганізма. Асабліва гэта трэба рабіць на ранняй стадыі інваліднасці. Увогуле, такія паслугі цяпер вельмі запатрабаваныя.

І хоць многае робіцца ў плане безбар'ернага асяроддзя, праблем тут хапае. Як кажуць самі інваліды-калясачнікі, яшчэ трэба многае змяніць, каб навакольнае асяроддзе стала больш дружалюбным да гэтай катэгорыі людзей.

> Новы цэнтр — не проста аб'ект з безбар'ерным асяроддзем. Гэта яшчэ і памяшканне, дзе людзі з абмежаванымі магчымасцямі могуць знаёміцца, займацца сваёй фізічнай формай, будаваць адносіны.

— Сапраўды, мы адчуваем, як змяняецца гарадское асяроддзе. Выйсці на вуліцу стала намнога прасцей — ёсць і пандусы, і пад'ёмнікі. Лягчэй трапіць у краму, аптэку, паліклініку, пошту. Кіроўцы, згодна з заканадаўствам, абавязаны дапамагчы трапіць у грамадскі транспарт і выйсці з яго. Але яшчэ многа нюансаў, на якія варта звярнуць увагу. У прыватнасці, не ўсюды ёсць аўтамесцы для інвалідаў, а бывае, што яны занятыя, трэба таксама больш актыўна весці работу па паніжэнні бардзюраў у адпаведных месцах, — адзначыў **старшыня Гродзенскай арганізацыі Рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў Сяргей ФЕШЧАНКА.**

Што датычыцца новага аб'екта, гэта, на яго думку, добрая нагода пакінуць сцены свайго жылля і атрымаць порцыю пазітыўных эмоцый. З новым цэнтрам многія віды спорту стануць даступныя большаму колу людзей з інваліднасцю.

Новы цэнтр адкрыты ў рамках праграмы ПРААН і накіраваны на ўкараненне здаровага спосабу жыцця для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. З ініцыятывай выступіла Гродзенскае аб'яднанне рэспубліканскай асацыяцыі інвалідаў-калясачнікаў. Праект атрымаў фінансавую падтрымку Еўрапейскага саюза. Дарэчы, на конкурс «Будзь здаровы!» было пададзена 104 заяўкі, але толькі каля 30 было прынята да разгляду. Пяць ініцыятыў атрымалі фінансаванне ў Гродзенскай вобласці. А усяго ў краіне падтрымана і рэалізуецца 25 інавацыйных ідэй, якія накіраваны на прафілактыку неінфекцыйных захворванняў і папулярызацыю здаровага спосабу жыцця.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота grodnonews.by.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

### Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Киселева, 61а |

**Предмет аукциона:**
**Изолированное помещение № 1 (1–2-й этаж)** (административное помещение), инв. номер **100/D-73862**, общ. пл. **173,8 кв. м**, Брестская обл., г. Брест, ул. Задворская, 4

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %:** | **53 528,65 белорусского рубля (снижение 60 %)** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004;** в евро (**EUR**) – **BY33BLBB30120191021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 04.09.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **09.10.2019** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **08.10.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны:** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

### ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: ОАО «МИНСКИЙ ЛАКОКРАСОЧНЫЙ ЗАВОД» (УНП 100645846), г. Минск, ул. Бирюзова, 4, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридический момент», тел. +375 (29) 616-50-57.

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее — торги) будут проведены: **28 октября 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**. Прием заявок и задатков по 25.10.2019 г.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-66102, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бирюзова, 4, площадь 150,4 кв. м. Назначение — здание специализированное складов, торговых баз, без материально-технического снабжения, хранилищ, наименование — склад | 42 600,00 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-66100, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бирюзова, 4, площадь 37,6 кв. м. Назначение — здание неустановленного назначения, наименование — производственное здание | 14 300,00 |
| 3 | К;апитальное строение с инвентарным номером 500/С-66101, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бирюзова, 4, площадь 375,1 кв. м. Назначение — здание специализированное складов, торговых баз, без материально-технического снабжения, хранилищ, наименование — склад | 125 000,00 |

Повторные торги в электронной форме в будут проведены: **14 октября 2019 г**. с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**. Прием заявок и задатков по 11.10.2019 г. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 10.07.2019 г.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 4 | Объект недвижимости в составе: изолированное помещение с инв. № 500/D-708151466 (Кабинеты) – часть капитального строения с инв. № 500/С-32874 с учетом доли инженерных сетей и элементов благоустройства, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 500000000006002237 | 108 355,34 |
| 5 | Объект недвижимости в составе: капитальное строение с инв. № 500/С-25208 (В2/к Цех по производству тары) с учетом доли инженерных сетей и элементов благоустройства, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 500000000006002237 | 953 004,78 |
| 6 | Объект недвижимости в составе: капитальное строение с инв. № 500/С-25513 (Л 1/к Здание пункта слива железнодорожных цистерн и приема сыпучего сырья) с учетом доли инженерных сетей и элементов благоустройства, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 500000000006002237 | 68 817,76 |
| 7 | Объект недвижимости в составе: капитальное строение с инв. № 500/С-1021204 (Подъездной железнодорожный путь), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 500000000006002237 | 117 079,30 |
| 8 | ГАРАЖНЫЕ ВОРОТА «STE-30» | 2 430,00 |
| 9 | КОМПРЕССОР 2ВН -20.5-13 | 2 970,00 |
| 10 | П/АВТ. ЛИНИЯ ИЗГОТ. ЖЕСТ. БАНОК V-2 | 46 890,00 |
| 11 | Полуавтомат дозировочно-наполнительный ПРК.081 | 4 680,00 |
| 12 | Грузовой бортовой автомобиль IVECO 49.10 рег. номер AI 9650-7, 1997 г. в. | 4 860,00 |
| 13 | Легковой вагон VOLKSWAGEN TRANSPORTER рег. № 9615 OI-7, 1995 г. в. | 4 230,00 |

Местонахождение – г. Минск, ул. Бирюзова, 4. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.

**Для участия в торгах необходимо** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY**; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

СЯБРОЎСТВА

# КУЛЬТУРНЫЯ МАСТЫ З БЕЛАРУСКІМІ РЭГІЁНАМІ

Тыдні Германіі — 2019 праходзяць з 24 верасня да 31 кастрычніка

**Яны пазнаёмяць з нямецкім кінамастацтвам і музыкай, тэатральнымі пастаноўкамі і літаратурнымі навінкамі, дазволяць наведаць фотавыстаўкі, канцэрты і іншыя мерапрыемствы ў розных гарадах.**

Увогуле, паспяховае правядзенне гэтых і іншых шматлікіх і разнастайных мерапрыемстваў было б немагчымае без актыўнай падтрымкі беларускіх партнёраў, улад рэгіёнаў, дэпутатаў мясцовых Саветаў. Калі раней Тыдні Германіі ладзіліся пераважна ў Мінску, то апошнім часам назіраецца, так бы мовіць, рэгіяналізацыя іх правядзення. Сёлета Тыдні пройдуць у 12 гарадах краіны. Напрыклад, у Баранавічах адбудзецца фотамарафон «Мастацтва. Bauhaus 100». Трэба будзе зрабіць па 10 прапанаваных тэмах 10 фотаздымкаў за 10 гадзін. Самыя крэатыўныя работы стануць часткай выстаўкі, а пераможцы атрымаюць прызы.

Пасябраваў з Баранавічамі і нямецкі Майнц, сталіца зямлі Рэйнланд-Пфальц з насельніцтвам каля 220 тысяч жыхароў. У 1995 годзе было заснавана таварыства дружбы Майнц — Мінск. З таго часу яно актыўна ўдзельнічае ў арганізацыі розных мерапрыемстваў у Беларусі. І не толькі ў Мінску. З 2010 года яго намаганнямі ў рамках Тыдняў у Беларусі дэманструюцца кароткаметражныя фільмы нямецкага фестывалю Shorts at Moonlight. Сёлета для паказу ў Баранавічах з больш чым 100 сюжэтаў былі адабраны самыя лепшыя фільмы.

Памяць пра мінулую вайну. Гэта тэма не засталася па-за ўвагай арганізатараў з абодвух бакоў. У Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце чакаецца адкрыццё перасоўнай выстаўкі «Лагер смерці Трасцянец. Гісторыя і памяць». Яшчэ раней выстаўка дэманстравалася ў Гродне, Гомелі, Брэсце і іншых гарадах.

У Барысаве фотавыстаўка «Баварыя» пазнаёміць наведвальнікаў з краявідамі гэтай зямлі. У работах аўтар — Ксенія Гуніна-Авербург — імкнулася адлюстраваць прыгажосць гэтых сапраўды маляўнічых мясцін. З удзелам Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева пройдзе выстаўка кніг для дзяцей на нямецкай мове Lest mit uns!.

Мазыр чакае варкшоп і канцэрт нямецкай рок-групы Solche. Яе музыканты з горада Хемніца ў Саксоніі даволі вядомыя ў сабе на радзіме і за мяжой. На іх рахунку чатыры альбомы, больш за 500 канцэртаў у Расіі, Румыніі, Чэхіі, Германіі і Швейцарыі. Цяпер вось канцэрты ў стылі Philofolk у Беларусі. Іх арганізатары ўпэўнены, што песні Solche дазволяць публіцы правесці выдатны вечар і пераканацца ў тым, што складаныя тэксты і танцавальная рок-музыка не абавязкова адно аднаго выключаюць. У сваю чаргу беларускі рок-гурт «Версія» падзеліцца сваім майстэрствам і ўражаннямі аб Германіі ў прэзентацыі «Саксонія — наша версія» ў час канцэрта ў Полацкім дзяржаўным універсітэце.

Зразумела, каб лепш ведаць адзін аднаго, трэба часцей сустракацца, абменьвацца цікавай інфармацыяй, візітамі дружбы. У Маладзечна запланаваны круглы стол «Нямеччына і беларускія традыцыі і звычаі». Думаецца, яго ўдзельнікам будзе аб чым пагаварыць і што расказаць па гэту тэму. Як і ў Полацку, дзе маладыя людзі, былыя стыпендыяты праграмы абмену DAAD у час мерапрыемства «Германія вачыма беларусаў» раскажуць аб сваім знаходжанні ў гэтай краіне і дадуць удзельнікам карысныя парады.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

ЮБІЛЕЙ

# Час сталасці, але не спакою

**На днях Стаўбцоўская раённая газета «Прамень» адзначыла 80-годдзе. На працягу гэтага часу раёнка мяняла свае назвы, але нязменным заставаўся змест публікацый, у якіх адлюстроўвалася шматграннае жыццё раёна — эканамічнае, сельскагаспадарчае, сацыяльнае, культурнае. І, вядома ж, не абыходзілася без канструктыўнай крытыкі, якая дапамагала своечасова выпраўляць недахопы. І сёння газета захоўвае традыцыі, якія закладваліся гадамі папярэднікамі.**

— 80-годдзе мы сустракаем з добрымі паказчыкамі ў рабоце. Галоўны з іх — гэта прызнанне чытачоў. Сёлета ў намінацыі «Найлепшыя друкаваныя СМІ Мінскай вобласці» мы занялі ІІІ месца. Пастаянны ўдзел ва ўсіх творчых конкурсах таксама прыносіць вынік. Толькі апошнім часам мы адзначаны дыпломамі як пераможцы конкурсу ў намінацыі «Прапаганда ведаў у вобласці забеспячэння бяспекі жыццядзейнасці насельніцтва», за асвятленне пытанняў гісторыка-краязнаўчай, сацыяльнай тэматыкі, за творчы падыход у рэалізацыі маладзёжнай палітыкі і іншыя, — паведаміла галоўны рэдактар Нэлі Астрэйка. — Сёння калектыў абнаўляецца, маладзее, хачу, каб гэта быў калектыў аднадумцаў, бо робім агульны прадукт — газету. Сапраўдныя майстры сваёй справы — Надзея Баталка, Святлана Жыбуль, Таццяна Пяткевіч. Цікавы творчы падыход да справы ў нашага маладога журналіста Ксеніі Рубін, якая старанна асвойвае азы рэпарцёрскай справы, работу на сайце і на радыё. Асаблівыя словы падзякі за працу хачу сказаць нашым ветэранам: Фёдару Бандаровічу, Васілю Зянько, Лёнгіну Ваяводскаму, Ганне Бычынскай, Таццяне Шалькевіч, якія і сёння імкнуцца падтрымаць імідж «Праменя».

«Звяздоўцы» віншуюць сваіх калег са святам і зычаць ім новых поспехаў у творчасці.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

СВЯТА Ў ХАТУ!

# ДРЫБІН ЗАПРАШАЕ НА СВАЁ 450-ГОДДЗЕ

**Сёлета гэтае невялічкае мястэчка адзначае немалы ўжо юбілей — менавіта 450 гадоў таму Дрыбін згадваўся ўпершыню ў пісьмовых крыніцах. З гэтай прыемнай нагоды ўсіх ахвотных запрашаюць на свята, якое адбудзецца ў суботу, 28 верасня.**



Як паведамілі арганізатары, а 9-й гадзіне распачнуць работу тэматычныя пляцоўкі арганізацый і ўстаноў раёна, гульнявыя пляцоўкі і фотазоны.

Непасрэдна святочная праграма пачнецца а 10.45 з паказальнага выступлення мажарэтак. Афіцыйная частка прадугледжвае наданне статусу «Ганаровы грамадзянін Дрыбінскага раёна» знакамітым яго жыхарам, ушанаванне былых кіраўнікоў раёна, вызначэнне пераможцаў у намінацыях «Старажыл» і «Самы маленькі жыхар», падвядзенне вынікаў раённага конкурсу па добраўпарадкаванні «Дрыбіншчына квітнеючая», дэфіле валеных і саламяных вырабаў.

Увечары свята працягне канцэрт саліcтаў мясцовага цэнтра культуры, які пачнецца а 19-й гадзіне. А ўжо ў 20.00 усіх гасцей парадуе выступленне заслужанай артысткі Беларусі Іны Афанасьевай. Напрыканцы гэтага дня ўсіх чакае яркае відовішча — маляўнічы салют!


**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 29.10.2019 аукциона по продаже производства в г. Могилеве**

Лот № 1: **Изолированное помещение с инв. № 700/D-128364 — Мастерская прицепного участка**, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ш. Чаусское, 4/2-2, общей площадью 529,8 кв. м. Назначение: помещение транспортного назначения. **Кран-балка, инв № 2369, кран-балка, инв № 1357, подъемник ПТО-16, инв № 2299; подъемник ПТО-42, инв № 2386, подъемник ПТО-16, инв № 23482, сварочный аппарат инв № 1011, подъемник ПТО-16, инв № 2415.** Сведения о земельном участке: кадастровый номер: 740100000007000071, адрес: Могилевская обл., г. Могилев, ш. Чаусское, 4, площадь — 3,2547 га (право аренды, доля в праве 25609/34260), целевое назначение земельного участка: земельный участок для использования под административное здание, мастерские и объекты хозяйственного назначения. Отдельный земельный участок для обслуживания Лота № 1 не выделен.

**Начальная цена продажи: 240 000,00 бел. руб. с учетом НДС**
**Сумма задатка 24 000,00 бел. рублей**

**Аукцион состоится 29 октября 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Прием заявлений: по 28.10.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «АТЭК-Могилев», УНП 700012173, г. Могилев, Чаусское шоссе, 4

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пять) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Организатор аукциона**: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**



**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона / оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «ВЛАДИОЛТРАНС», г. Минск, ул. Некрасова, д. 47, ком. 7, 4-й этаж, адм. пом. № 13 |

**Предмет электронных торгов:**
Административный корпус (здание административно-хозяйственное) общей площадью 5637,8 кв. м, инв. номер 610/С-17607, расположенный по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Лошницкий с/с, аг. Лошница, ул. Рабочая, д. 1. Составные части и принадлежности: подвал, две пристройки

**Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,6326 га, предоставлен Продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания административного корпуса

**Начальная цена без учета НДС: 58 540,38 бел. руб.**
**(шаг аукциона: 2 927,02 бел. руб.)**

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 24.08.2019

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления:** | Осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, Кудренок Елена Александровна, контактный телефон +375 (29) 644-38-92 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на Р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но **не позднее 30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, а также оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение в течение **5 (пяти)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 14.10.2019** в 12.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by)**

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация):**
**11.10.2019** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by)**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 26 верасня 2019 года.**